

НАВАГОДНІЯ ТРАДЫЦЫІ КІТАЯ 5

ЗОРНАЯ ГАМА АНАСТАСІІ МАСКВІНОЙ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 СТУДЗЕНЯ 2023 г. СУБОТА № 13 (29893)

## КОРАТКА

• **Натарыусы ў 2023 годзе правядуць 6 рэспубліканскіх акцый па бясплатным кансультаванні.**

• Мінабароны і Міністэрства аховы здароўя карэкціруюць патрабаванні да стану здароўя тых, хто паступае на ваенную службу.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАВАЛЕЎСКІ, начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах:**

*«Калі гаварыць пра тое, чаму было прынята рашэнне ўвесці новы падатковы рэжым, то трэба адзначыць, што ў папярэднія гады фізічныя асобы, якім не патрабавалася рэгістрацыя ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, маглі прымяняць розныя падатковыя рэжымы, як правіла, заснаваныя на фіксаваным плацяжы, не які залежаў ад атрымананага даходу. Гэта выклікала шэраг супярэчнасцяў.*

*У прыватнасці, адзіны падатак аплачваўся наперад, і бывала так, што плацельшчык не змог зарабіць нават гэтую суму ці з нейкіх абставін не змог весці дзейнасць. Таму было прынята рашэнне выпрацаваць новы падатковы рэжым — падатак на прафесійны прыбытак. Яго ключавая асаблівасць у тым, што абкладаецца падаткам непасрэдна атрыманы даход. Ёсць прыбытак — з яго выплачваецца падатак, няма прыбытку — нічога плаціць не патрабуецца. У сусветнай практыцы такія рэжымы падаткаабкладання лічацца найбольш перспектыўнымі, бо яны самыя справядлівыя. Пераход на ППД з'яўляецца добраахвотным».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «У НАС НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ АБАРОНЫ, БЯСПЕКІ, АЛЕ І ДЛЯ МІРНАГА ЖЫЦЦЯ ДАСТАТКОВА ЎСЯГО»

### Аляксандр Лукашэнка наведаў выстаўку навукова-тэхнічных дасягненняў «Беларусь інтэлектуальная»

**З найноўшымі навуковымі распрацоўкамі беларускіх навукоўцаў і студэнтаў кіраўнік дзяржавы азнаёміўся на пляцоўцы Нацыянальнага выставачнага цэнтра «БелЭкспа». Дасягненні айчыннай навукі тут прадстаўлены ўзорамі электратранспарту і лятальных апаратаў, распрацоўкамі ў сферы штучнага інтэлекту і IT-тэхналогій, інавацыйным прыборабудаваннем, біятэхналогіямі, медыцынскай тэхнікай і фармацэўтыкай. Апошнія ноу-хау Прэзідэнту прэзентавалі таксама ваенныя навукоўцы, прадстаўнікі аграпрамысловага комплексу, эколагі. Адным словам, каля тысячы ўнікальных распрацовак — ад космасу да здаровага харчавання — дэманструе, што беларуская навука не проста ідзе ў нагу з часам, а на некалькі крокаў апераджае яго.**



Фота БелТА.



Падчас знаёмства з распрацоўкамі маладых вучоных Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта наша будучыня. Па словах міністра адукацыі Андрэя Іванца, сёння кожны пяты даследчык у Беларусі з'яўляецца маладым вучоным ва ўзросце да 35 гадоў.

«Мы калісьці дамовіліся з кіраўніком акадэміі (старшынёй Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімірам Гусаковым. — **«Зв.»**), што павінны паказаць тое, што ўмеем, — адзначыў Прэзідэнт. — І ўмеем не штосьці — тут, як мяне інфармуюць, каля тысячы найноўшых распрацовак. Людзям патрэбна паказаць гэту выстаўку. Мы ўвесь час паказваем трактар, аўтамабіль, страляем, узрываем... А ў нас не толькі для абароны, бяспекі, але і для мірнага жыцця дастаткова ўсяго».

СТАР. 2




# Вечная памяць удзячных нашчадкаў

**«Хатынь» і «Трасцянец», «Кацюшы» ў Оршы і абеліск на плошчы Перамогі ў Мінску, капліца на Буйніцкім полі і Брэсцкая крэпасць... Гэтыя мемарыялы сталі сапраўднымі сімваламі трагедыі і непакорлівасці беларускага народа. Аднак у кожным раёне Беларусі ёсць і іншыя абеліскі — невялікія, сціплыя, нярэдка схаваныя ў лесе. Яны стаяць на месцы пахаванняў партызан і чырвонаармейцаў, мірных жыхароў, якія загінулі ад рук фашыстаў. Гэтыя сціплыя помнікі — таксама сімвал. Нязгаснай народнай памяці, бо ніводны з іх не закінуты.**

**Менавіта пра такія помнікі мы і расказжам у праекце «Абеліскі параненай зямлі». Пра гісторыю іх узнікнення, пра герояў і ахвяр, якія пад імі ляжаць. І, безумоўна, пра людзей, якія захоўваюць гэтыя знакі народнай памяці, даглядаюць іх, расказваюць аб іх новым пакаленням.**

**У той час, як у Еўропе ў прыступе шалёнага бяспамяцтва знішчаюць помнікі вызваліцелям ад фашызму і руйнуюць іх магілы, мы шануем кожны, нават невялікі помнік. Занадта вялікую цану мы заплацілі, каб забыцца, каму мы абавязаны жыццём. Таму і напісалі на адным мемарыяле самую бяспрэчную для нашага народа, для ўсіх пакаленняў ісціну: «Мы жывём, пакуль помнім. Мы жывыя, пакуль нас помняць»**

СТАР. 8-9

# «У НАС НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ АБАРОНЫ, БЯСПЕКІ, АЛЕ І ДЛЯ МІРНАГА ЖЫЦЦЯ ДАСТАТКОВА ЎСЯГО»

**_(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)_**

Прэзідэнт папрасіў прадэманстраваць, што канкрэтна распрацоўвае моладзь. Каля стэнда, які прэзентуе распрацоўкі для космасу, кіраўніку дзяржавы далажылі, што першы спадарожнік ужо актыўна працуе, і прадэманстравалі новы, які ўжо ў маі будзе запускацца ў космас з касмадрома «Усходні». Як заўважыў Андрэй Іванец, распрацоўка поўнасцю маладзёжная. «Гэта вялікая перспектыва», — кажучы пра дасягненні вучоных у касмічнай сферы, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Азнаёміўшыся з апошнімі біямедыцынскімі распрацоўкамі, беларускі лідар спыніўся каля ўзораў, якія дэманструюць поспехі беларускіх вучоных у галіне штучнага інтэлекту. «Да якога ўзроўню мы ўжо дайшлі ў штучным інтэлекце?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы ў вучоных. «Да сусветнага ўзроўню дайшлі ўжо даўно», — адказалі навукоўцы. Вучоным, якія ў нацыянальную скарбніцу айчынных распрацовак уносяць канкрэтныя дасягненні ў галіне штучнага інтэлекту, Прэзідэнт паабяцаў асабістую падтрымку і дапамогу.

Каля экспазіцыі з беларускімі камп'ютарамі вытворчасці «Гарызонт» Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што на яго рабочым стале ўжо з'явілася айчынная тэхніка, якая замяніла замежны камп'ютар, што стаяў дагэтуль. Генеральны дырэктар ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Гарызонт» Юрый Прэдка далажыў, што сёлета прадпрыемства дойдзе да ўзроўню 80 % інавацыйнай прадукцыі. Кіраўніку дзяржавы прадэманстравалі апошнія ўзоры, створаныя на прадпрыемстве, сярод якіх — празрысты тэлевізар. Гэта, па словах генеральнага дырэктара прадпрыемства, распрацоўка нават не заўтрашняга, а ўжо паслязаўтрашняга часу.

Прэзідэнт заўважыў, што «Гарызонт» замахнуўся на многае, нягледзячы на тое, што прадпрыемства знаходзіцца пад сур'ёзным ціскам і крытыкай. «Вы малайцы, — пахваліў Аляксандр Лукашэнка. — Вы паказалі, што мы вырабляць можам усё. І, як бы ні было складана, мы гэта зробім». Ужо, па словах беларускага лідара, і на Захадзе пачынаюць разумець, што з Беларуссю трэба супрацоўнічаць.

Гаворачы пра распрацоўкі «Гарызонта», Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта будучыня на нашым вялікім рынку. «Пакуль дзякуй, але 70 % да канца года», — такую задачу паставіў ён, маючы на ўвазе складнікі беларускага камп'ютара. Па словах Прэзідэнта, за развіццём сферы штучнага інтэлекту і мікраэлектронікі — будучыня. «Калі мы хочам быць вялікай, з пункту гледжання інтэлекту, цывілізаванай дзяржавай — гэта аснова, гэта будучыня», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускаму лідару расказалі аб прымяненні лазерных тэхналогій у медыцыне і іншых сферах, перавагах інавацыйных акумулятарных батарэй, прадэманстравалі апошнія ўзоры электратранспарту. Вучоныя падзяліліся сваімі распрацоўкамі ў галіне абароны і бяспекі. У прыватнасці, прадэманстравалі спектр беспілотных лятальных апаратаў, якія, дарэчы, прызначаны не толькі для ваенных мэт. Беспілотнікі айчыннай вытворчасці выкарыстоўваюцца і ў аграпрамысловым комплексе, у прыватнасці, для апрацоўкі зямлі ад шкоднікаў.

Выстаўку навукова-тэхнічных дасягненняў «Беларусь інтэлектуальная», якая працуе на працягу гэтых выхадных, можа наведаць кожны. Аўтары навуковых распрацовак, сярод якіх як вопытныя навукоўцы, так і маладыя вучоныя, у тым ліку школьнікі, падрыхтавалі шмат цікавага нават для самага запатрабавальнага наведвальніка.

**Вераніка КАНЮТА.**

## У тэму

Як у размове з журналістамі адзначыў **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ,** на выстаўцы навукова-тэхнічных дасягненняў «Беларусь інтэлектуальная» прадстаўлены самыя апошнія навінкі ды распрацоўкі. «Тут іх больш за тысячу, — звярнуў увагу ён. — Тут няма старых распрацовак. Усё самае новае. Мы прадставілі кіраўніку дзяржавы шэраг распрацовак сусветнага ўзроўню. Нават ёсць такія рэчы, дзе мы ідзём наперадзе: у галіне штучнага інтэлекту, мікраэлектронікі».

Уладзімір Гусакоў расказаў, што беларускія вучоныя асвоілі чыпы і мікрасхемы. Гэта, па яго словах, стапрацэнтныя нашы распрацоўкі, без якіх-небудзь замежных камплектуючых. «Навука ніколі не была стратнай, — падкрэсліў старшыня Прэзідыума НАН Беларусі. — Навука заўсёды акупная і высокаакупная. Літаральна на ўсе нашы распрацоўкі ўжо ёсць дагаворы. Я дэманстраваў маленькі мікраэлектронны датчык — учора падпісаны дагавор на мільён долараў. Перад новым годам прадалі лазераў розных памераў таксама на мільён долараў. У нас ёсць праграмы, якія маюць акупнасць больш за 100 долараў на рубель затрат. Ніжэй за 5—10 долараў на рубель затрат — такіх распрацовак няма».

# БЕЛАРУСКІ ТЭТРАПАК І ВАКЦЫНА СУПРАЦЬ РАКУ

## Удзельнікі выстаўкі навукова-тэхнічных дасягненняў «Беларусь інтэлектуальная» падзяліліся сваімі распрацоўкамі

Андрэй МАМАЕЎ — адзінаццацікласнік адной са школ Рагачова і навучэнец Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. А яшчэ ён адзін з аўтараў шэрагу ўнікальных біяраскладальных упаковачных матэрыялаў. Юны вучоны прадэманстраваў ядомыя плёнкі і біяраскладальныя ўпаковачныя матэрыялы, якія ствараюцца з крухмалу, іншых палімераў і не маюць аналагаў на тэрыторыі краін СНД. «Упершыню ў свеце ў такія плёнкі мы упакавалі мёд, цукеркі, дазаваныя наборы спецый, дазаваныя наборы для супу і кашы, — расказаў школьнік. — Мы зрабілі ўпаковачны матэрыял з антыаксідантнымі, антымікробнымі ўласцівасцямі для падаўжэння тэрміну захоўвання шматлікай прадукцыі. Напрыклад, у такую ўпакоўку можна змясціць сметанковае масла: яно не будзе псавацца, пры гэтым смакавыя якасці масла палепшацца. Для аматараў падарожжаў мы стварылі гарбату ў выглядзе плёнак. Для касманаўтаў распрацавалі зубную пасту, калі для чысткі зубоў не патрабуецца вада».

Навучэнцы Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка знайшлі і беларускую замену тэтрапаку. «Пакрываючы афсетную паперу растворамі палімераў, мы атрымалі такую ўпакоўку, — падзяліўся дэталямі Андрэй Мамаеў. — Яна складаецца з кардону, крухмальнай плёнкі, воску, плёнкі з гарбатай і актываваным вугалем. Дзякуючы гэтаму яна поўнасцю біяраскладальная. Пры гэтым захоўвае ўсе карысныя рэчывы, з'яўляецца вільгаценепранікальнай, не прапускае кісларод і ўльтрафіялетавыя прамяні, што дазваляе прадукту захоўвацца доўгі час. Выраблены тэтрапак поўнасцю з айчыннай сыравіны».

Для тых, хто не можа справіцца з такой далікатнай праблемай, як храп падчас сну, навукоўцы прапаноўваюць спецыяльную капу. Пра распрацоўку ў галіне медыцынскай тэхнікі распавёў **рэктар Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, член-карэспандэнт НАН Беларусі Сяргей РУБНІКОВІЧ**: «Капа прымяняецца для лячэння пацыентаў з храпам і сіндромам абструктыўнага апноэ сну, які характарызуецца часовым спыненнем дыхання падчас сну ад 10 да 20 секунд, у цяжкіх выпадках — да 2-3 хвілін. У некаторых выпадках чалавек не спіць больш як палову ночы. У выніку — санлівасць, разбітасць, апатыя. Наша распрацоўка дазваляе высунуць ніжнюю сківіцу ў індывідуальнае становішча і не перашкаджае закрыццю дыхальных шляхоў падчас сну». Як паведамілі распрацоўшчыкі, спецыяльная капа ўжо ёсць у продажы, цана даступная.

Два топавыя прадукты ў галіне фармацэўтыкі, якія, па меркаванні вучоных, зменяць нашу будучыню, прэзентаваў **намеснік дырэктара РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. Аляксандрава, акадэмік НАН Беларусі Сяргей КРАСНЫ.** Па-першае, гэта вакцына супраць раку яечнікаў «Еленаген». «Скончыліся клінічныя выпрабаванні, атрыманы самыя лепшыя вынікі ў свеце, — звярнуў увагу Сяргей Красны. — Ні ў якой краіны нават блізка няма падобнага! У цяперашні час у Рэспубліцы Беларусь распачата лабараторная вытворчасць гэтага прэпарату. Выпускаецца прыкладна па 40 флаконаў у тыдзень. У наступным месяцы мы плануем пачаць маштабізацыю вытворчасці. Спадзяёмся выйсці прыкладна на тысячу флаконаў у тыдзень. У такім разе можна будзе яшчэ правodзіць даследаванні ўздзеяння прэпарату на іншыя віды злаякасных пухлін».

Другі прадукт, які айчынныя анколагі распрацавалі разам з Кобрынскім масларобна-сыраробным заводам, — лячэбнае харчаванне новага віду для хворых на анкалагічныя захворванні. «Гэты прадукт вырашае дзве вялікія праблемы: па-першае, дазваляе нам адмовіцца ад закупкі імпартных адпаведных прадуктаў і аднаўляе пацыентам бялковы абмен, — заўважыў Сяргей Красны. — Другая праблема, якую мы вырашылі, — выкарыстанне вялікай колькасці малочнай сыроваткі, якая ўтвараецца пры вытворчасці масла і сыру. Раней яна прадавалася за капейкі, а цяпер выкарыстоўваецца для комплекснага харчавання, якое вельмі дапамагае пацыентам. Пры гэтым такое харчаванне неабходна не толькі анкалагічным пацыентам. Яно выкарыстоўваецца пры любым хранічным захворванні, якое суправаджаецца бялковай недастатковасцю. Такое харчаванне дазваляе значна павысіць выжывальнасць анкалагічных пацыентаў амаль на 30 %. Такога эфекту не даюць ні адны лекі».

# «Калі мы разам будзем займацца агульнай справай, гэта абавязкова дасць добры вынік»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава ўзяла ўдзел у пасяджэнні Лепельскага райвыканкама Віцебскай вобласці. Падчас сустрэчы з актывам раёна былі ўзняты пытанні рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады» і падведзены вынікі работыназіральных камісій за 2022 год.**



Фота БелТА

Лепельшчына — маляўнічы куток нашай краіны, скрозь пранізаны воднымі артэрыямі. Тут размяшчаюцца беларускія здраўніцы: ваенны санаторый, дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Жамчужына», горад мае выгаднае геаграфічнае становішча — адным словам, усе фактары садзейнічаюць не толькі замацаванню кадраў, але і паляпшэнню дэмаграфічнай сітуацыі ў раёне. Галоўная задача кіраўніцтва — забяспечыць маладых спецыялістаў жыллём і добрай заработнай платай, стварыць камфортныя ўмовы працы.

Аб тым, што замацаванне ўрачоў у Лепельскім раёне знаходзіцца на высокім узроўні — паказчык складае 100 працэнтаў, — на пасяджэнні райвыканкама далажыў галоўны ўрач Лепельскай цэнтральнай раённай бальніцы Аляксей Пракоф'еў. Ён таксама адзначыў, што гэты ж паказчык сярод астатняга медперсаналу значна ніжэйшы — прыкладна 70 працэнтаў, — што абумоўлена міграцыяй кадраў у іншыя ўстановы медыцынскага абслугоўвання Лепельшчыны, аднак усе медработнікі застаюцца ў межах раёна. З мэтай падтрымкі маладых спецыялістаў кіраўніцтва выдзяляе арэнднае жыллё. Так, летась урачы засяліліся ў чатыры новыя арэндныя кватэры, усяго за апошнія два гады медработнікам было выдзелена 26 кватэр і месцаў у інтэрнаце.

Наталля Качанава адзначыла важнасць правядзення рэальнай работы па дыспансерызацыі насельніцтва без бюракратызму і пацікавілася, якая работа з насельніцтвам праводзіцца па гэтым пытанні. «Абавязковая штогадовая дыспансерызацыя насельніцтва — ідэя выдатная, заканадаўча замацаваная. Важна на месцах прадумаць стратэгію яе эфектыўнай рэалізацыі. Вы маеце права самастойна абраць найбольш прыдатную для раёна схему працы, каб было зручна і людзям, і лекарам, і, галоўнае, дзейсна», — падкрэсліла Наталля Іванаўна.

Пакуль у Лепельскай раённай бальніцы складаюць аптымальную сістэму працы з насельніцтвам, магчыма, яўка на дыспансерызацыю для грамадзян будзе абрана месяцам нараджэння.

Старшыня Савета Рэспублікі абазначыла праблемы ў сферы аховы здароўя раёна, на якія варта звярнуць увагу: дэмаграфічная сітуацыя, павышэнне смяротнасці грамадзян па прычыне сардэчна-сасудзістых захворванняў, высокі працэнт людзей, якія злоўжываюць алкаголем. «Да вырашэння апошняга пытання павінны падключыцца не толькі ўрачы, але і ўсе арганізацыі і службы. Мы не маем права адкідаць каго-небудзь, гэта ўсе нашы людзі».

Тыя, хто пакутуе ад алкагольнай залежнасці, міжволі зніжае паказчык не толькі сферы аховы здароўя, але і бяспекі. Так, у 2022 годзе ад знешніх прычын у Лепельскім раёне загінулі 19 чалавек, 12 з якіх знаходзіліся ў стане ап'янення. З 36 пажараў 25 адбыліся па прычыне невыканання правілаў бяспекі жыццядзейнасці катэгарыяванымі грамадзянамі. З мэтай зніжэння колькасці дарожна-транспартных здарэнняў, на якіх летась загінулі чатыры чалавекі, было ўстаноўлена шэсць штучных няроўнасцяў і абсталявана пяць пешаходных дарожак. Траса М3, якая з'яўляецца галоўнай транспартнай артэрыяй Лепеля, адначасова з'яўляецца і месцам павышанай небяспекі: недастатковае асвятленне, дзікія звяры, якія выходзяць на дарогу. «Сёлета пачнуцца рамонтныя работы на лепельскай трасе, ужо з бюджэту выдзелены сродкі», — адзначыла Наталля Качанава.

Падводзячы вынік сустрэчы з актывам раёна, старшыня верхняй палаты парламента яшчэ раз звярнула ўвагу на адказнасць кожнага кіраўніка на месцах за фарміраванне ўстойлівай эканомікі і пазітыўнага іміджу рэгіёна. «Калі ўсе пачнуць займацца агульнай справай, гэта абавязкова дасць добры вынік».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

_Аб іншых адрасах паездкі Наталлі Качанавай на Лепельшчыну — у найбліжэйшым выпуску «Мясцовага самакіравання»._

На варце харчовай бяспекі

# САМЫ НОВЫ І ВЫСОКАПРАДУКЦЫЙНЫ Ў КРАІНЕ

## У Пінскім раёне ўрачыста адкрылі буйны свінагадоўчы комплекс

**Студзеньская непагадзь не перашкодзіла святочнаму настрою шматлікіх удзельнікаў імпрэзы на поўдні Пінскага раёна. Чырвоную стужачку, якая дала зялёнае святло важнаму ў справе харчовай бяспекі аб'екту, перарэзалі пад дружныя апладысменты прысутных. Гэтая ганаровая місія выпала старшыні Брэсцкага аблвыканкама Юрыю ШУЛЕЙКУ, міністру энергетыкі краіны Віктару КАРАНКЕВІЧУ, намесніку міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзіміру ГРАКУНУ, гаспадарам комплексу.**





Фота БелТА.

Пабудавалі гэты сельскагаспадарчы аб'ект у рэкордна кароткія тэрміны. Распараджэнне «Аб рэалізацыі інвестыцыйнага праекта» было падпісана кіраўніком дзяржавы 26 студзеня 2022 года, і ўжо вясной на пляцоўку паміж вёскамі Малая Вулька і Вялікія Дзікавічы прыйшлі будаўнікі. Адразу быў узяты надзвычай высокі тэмп работы. На аб'екце адначасова працавала некалькі соцень чалавек. Летам тут шчыраваў будатрад, комплекс быў аб'яўлены абласной маладзёжнай будоўляй. Пры нарматыўных тэрмінах будаўніцтва ў 18 месяцаў рабочыя і спецыялісты дзяржаўнага аб'яднання «Брэстаблсельбуд» справіліся менш чым за год.

Як паведаміў **генеральны дырэктар названай будаўнічай кампаніі Уладзімір ВАБІШЧЭВІЧ,** для ўзвядзення аб'екта быў выбраны праект, што прадугледжвае самыя сучасныя тэхналогіі:

— Узялі на ўзбраенне дацкі вопыт з эканомным стаўленнем да электраэнергіі і цеплаэнергіі. Абсталяванне запраграмавана на такую работу, калі лішні корм і лішняя вада падавацца не будуць, паступае роўна столькі, колькі будзе ўжывацца жывёлай.

Комплекс належыць Пінскаму камбінату хлебапрадуктаў і разлічаны на 24 тысячы галоў свіней. Камбінат ужо мае падобную ферму каля населенага пункта Бакінічы і атрымлівае там 4,7 тысячы тон мяса ў год замест 3,5 тысячы праектных.



**Васіль НЕВАР, дырэктар Пінскага камбіната хлебапрадуктаў,** не без гонару адзначае, што існуючы комплекс зараз самы прадукцыйны ў нашай краіне. Самыя высокія сярэднясутачныя прывагі свіней па краіне атрымліваюць менавіта ў Бакінічах.

Яшчэ столькі ж свініны плануюць атрымліваць на новым комплексе. Такім чынам, у Пінскім раёне замахнуліся на вытворчасць у год каля дзевяці тысяч тон мясной сыравіны. Тады поўнасцю будуць задаволены патрэбы Пінскага мясакамбіната, бо да гэтай пары перапрацоўчае прадпрыемства вымушана купляць свініну ў Расіі. Паралельна комплекс стане свайго роду сыравіннай страхоўкай для іншых прадпрыемстваў рэгіёна. Сёння ў вобласці самая магутная мясная перапрацоўка ў краіне. На долю рэгіёна прыходзіцца амаль палова каўбасных вырабаў і трэціна мясных паўфабрыкатаў краіны.

На рэалізацыю інвестыцыйнага праекта патрачана 55,5 мільёна рублёў. З іх 25 мільёнаў — з пазабюджэтнага цэнтралізаванага фонду Міністэрства энергетыкі. Міністр Віктар Каранкевіч адзначыў, што міністэрства на сістэмнай аснове падтрымлівае рэалізацыю такіх праектаў, якія маюць на мэце развіццё малых населеных пунктаў, новыя рабочыя месцы, рост дабаўленай вартасці, паступленне падаткаў у мясцовы бюджэт.

Зараз завершана ўзвядзенне ўсіх вытворчых будынкаў комплексу, на завяршальнай стадыі мантаж абсталявання і добраўпарадкаванне тэрыторыі. Камплектацыя свінапагалоўя будзе весціся пачынаючы з наступнага месяца. Ужо закуплена 10 галоў высокапрадукцыйных кныроў у Даніі, жывёла знаходзіцца на каранціне перад засяленнем у новы свінакомплекс. А ўжо ў сярэдзіне лютага ферма-рэпрадуктар будзе запоўнена пяцістамі рамонтнымі свінкамі — так называюць свінаматак. Усяго на комплексе штомесяц будзе ўтрымлівацца да 16 тысяч свіней. На праектную магутнасць у 24 тысячы плануецца выйсці ў наступным годзе.

Як адзначыў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый Шулейка, у ходзе рэалізацыі гэтага інвестыцыйнага праекта дасягнуты адзіны тэхналагічны ланцужок — ад вытворчасці камбікорму да вырошчвання свіней у межах аднаго прадпрыемства:

— І не ў гэтым адным пастаўлены своеасаблівы рэкорд. Рэкорднымі былі тэмпы будаўніцтва, калі на пэўным прамежку часу тут працавала да 600 чалавек. Сёння гэта самы новы ў плане тэхналогій комплекс па вытворчасці свініны, якая так патрэбна нашай перапрацоўчай галіне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Партнёрства

# Дзве тысячы кіламетраў — не адлегласць

## Бізнес-дэлегацыя Башкартастана наведвае прадпрыемствы Гомельшчыны

**Гомельшчыну з двухдзённым візітам наведвае дэлегацыя Башкартастана на чале з кіраўніком рэспублікі Радзіем Хабіравым. Госці знаёмяцца са знакавымі аб'ектамі эканомікі, культурнай сферы. Акцэнт падчас візіту — на знаёмства з работай прадпрыемстваў — флагманаў Гомельшчыны, сярод якіх «Гомсельмаш», «Гомельскі хімічны завод», «Камінтэрн», «Гомельагракамплект», «Амкадор-Гомель». Важнай часткай праграмы візіту стала таксама наведванне мемарыяльнага комплексу «Вечны агонь» у Гомелі і манумента «Дзецям — ахвярам вайны» ў Жлобінскім раёне.**

Паўднёва-ўсходні рэгіён Беларусі прымае з працоўным візітам прадстаўнікоў буйнога, сярэдняга і малога бізнесу Рэспублікі Башкартастан. Летась супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі было адзначана шэрагам двухбаковых сустрэч, арганізавана некалькі бізнес-місій Башкартастана ў Гомельскую вобласць. Тры месяцы таму дэлегацыя беларускага рэгіёна на чале са старшынёй Гомельскага аблвыканкама Іванам Крупко пабывала з візітам ва Уфе. У бягучым годзе бізнес-дэлегацыя Башкартастана міжрэгіянальныя сустрэчы распачала менавіта з наведвання Беларусі.

Усталяванне прамых бізнес-кантактаў, узаемавыгаднае супрацоўніцтва прадпрыемстваў, сумесная работа па забеспячэнні тэхналагічнай незалежнасці і выхад на новыя рынкі — гэтыя і іншыя кірункі ўмацавання міжрэгіянальных сувязяў Гомельскай вобласці і Рэспублікі Башкартастан падчас сустрэчы абазначыў намеснік старшыні аблвыканкама Андрэй Конюшка.

Летась Гомельская вобласць значна актывізавала супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі-партнёрамі, у тым ліку і з Башкартастанам. Вынік двухбаковага ўзаемадзеяння — пазітыўная дынаміка ў эканамічнай сферы. Знешнегандлёвы абарот Гомельскай вобласці і Рэспублікі Башкартастан за студзень — лістапад мінулага года склаў звыш 39 мільёнаў долараў, у тым ліку вобласць экспартавала ў Башкартастан прадукцыі на 20 мільёнаў долараў.

Машынабудаванне, перапрацоўчая і харчовая прамысловасць, спорт і турызм — адны з перспектыўных кірункаў узаемадзеяння паміж беларускім і расійскім рэгіёнамі. Такое меркаванне выказаў падчас сустрэчы ў гомельскім аблвыканкаме прадстаўнік Рэспублікі Башкартастан пры гандлёвым прадстаўніцтве Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Канстанцін Клімін.

— Сёння абмяркоўваецца план па арганізацыі крамаў беларускіх прадуктаў харчавання ва Уфе, у Рэспубліцы Башкартастан, і гэта ўсё магчыма рэалізаваць. Сёння ў нашай дэлегацыі — у тым ліку і малы бізнес. Гатовы прапанаваць розныя вытворчыя магчымасці для прадпрыемстваў Беларусі, — падкрэсліў Канстанцін Клімін.

Падчас сустрэчы з прадстаўнікамі бізнес-дэлегацыі Башкартастана ў тым ліку была закранута тэма падрыхтоўкі да X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, сталіцай якога ў чэрвені стане якраз Уфа. Да такой знакавай падзеі напрацаваць і ўмацаваць сувязі, якія потым аформяцца ў рэальныя дагаворы і кантракты, — гэта, на думку ўдзельнікаў сустрэчы, у тым ліку важны складнік падобных міжрэгіянальных бізнес-місій.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Кітаі заявілі, што працягнуць спрыяць урэгуляванню канфліктаў на планеце



Кітайскія ўлады сёлета прадоўжаць садзейнічаць урэгуляванню канфліктаў і крызісных сітуацый у свеце. Аб гэтым заявіў кіраўнік МЗС КНР Цінь Ган, паведаміў ТАСС. «Мы чакаем, што ў 2023 годзе на нашай планеце будзе больш міру і спакою, менш канфліктаў і войнаў, — адзначаецца ў відэазвароце, з якім кіраўнік МЗС звярнуўся з нагоды набліжэння Новага года па месяцавым календары (сёлета надыходзіць 22 студзеня) да кіраўнікоў замежных дыпламатычных місій. — КНР адстойвае сумесную, комплексную і ўстойлівую канцэпцыю бяспекі, якая абапіраецца на супрацоўніцтва. Мы выступаем за вырашэнне канфліктаў шляхам перагавораў, за ўрэгуляванне спрэчак на аснове кансультацый». Як удакладніў Цінь Ган, Пекін «падтрымлівае ўсе намаганні, якія садзейнічаюць мірнаму ўрэгуляванню крызісных сітуацый». Ён адзначыў, што Кітай будзе яшчэ больш актыўна садзейнічаць збалансаванаму і талерантнаму глабальнаму развіццю.

### У пратэстах супраць павышэння пенсіённага ўзросту ўдзельнічала больш за мільён французаў

Каля 1,12 мільёна чалавек выйшла на вуліцы французскіх гарадоў для ўдзелу ў дэманстрацыях супраць павышэння пенсіённага ўзросту. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на тэлеканал BFMTV. Па ўсёй Францыі прайшло больш за дзвесце акцый. Пратэсты абвастрыліся на фоне агульнанацыянальнай забастоўкі супраць пенсіённай рэформы. Арганізатарамі выступілі восем вядучых прафсаюзаў краіны. Самыя шматлікія маніфестацыі прайшлі ў Парыжы, Марселі, Ліёне, Тулузе, Ліле і Нанце. Прафсаюзы, у сваю чаргу, ацэньваюць колькасць пратэстоўцаў як прыкладна ў два разы вышэйшую. Так, лідар прафсаюза «Усеагульная канфедэрацыя працы» (CGT) Філіп Марцінез распавёў, што акцыя ў Парыжы налічвала каля 400 тысяч удзельнікаў. Паводле яго інфармацыі, усяго ў краіне пратэставалі два мільёны чалавек. Прафсаюзы, якія арганізавалі акцыі пратэсту, таксама абвясцілі, што наступныя масавыя дэманстрацыі запланаваны на 31 студзеня.

### Калумбійскія маракі выратавалі мужчыну пасля месячнага дрэйфу на яхце па Карыбскім моры

Жыхар Дамініканы Элвіс Франсуа ўжо месяц дрэйфаваў на аварыйнай яхце па Карыбскім моры. Ён напісаў на борце «HELP» і дзякуючы гэтаму змог выратавацца, паведаміла РІА «Навіны». Калумбійскія ВМС сумесна з Галоўным марскім кіраваннем, марскім саюзам і Нацыянальнай авіяцыйнай ваенна-марской службай Панамы правялі спецаперацыю па выратаванні мужчыны за 120 марскіх міль на паўночны захад ад Пуэрта-Балівара ў дэпартаменце Ла-Гуахіра. Выратаваны расказаў, што надзвычайнае здарэнне адбылося ў снежні мінулага года недалёка ад вострава Сен-Мартэн на Нідэрландскіх Антыльскіх астравах непадалёк ад узбярэжжа Венесуэлы. Падчас рамонту судна яго знесла ў адкрытае мора.

# БЫЛЫХ ДЗЯЦЕЙ НЕ БЫВАЕ

## Што трэба ведаць пра аліменты?

**Паводле даных Белстата, у Беларусі ў 2021 годзе на тысячу заключаных шлюбаў прыйшлося 576 разводаў. За 2022 год суадносіны гэтых лічбаў пакуль не падлічаныя, але можна выказаць здагадку, што наўрад ці яны будуць больш аптымістычнымі. І яшчэ адна лічба: сёння органамі прымусовага выканання Міністэрства юстыцыі вядзецца каля 80 тысяч выканаўчых вядзенняў па аліментах і выплатах на ўтрыманне дзяцей.**

Каханне праходзіць, але ж дзеці застаюцца, і яны не могуць стаць «былымі» ні пры якіх абставінах. Цывілізаваны падыход — калі два некалі блізкіх чалавека, скасаваўшы шлюб, наладжваюць супрацоўніцтва (у тым ліку фінансавае) дзеля шчасця і дабрабыту сваіх дзяцей. Але кожны месяц у судах разглядаюцца дзясяткі зваротаў аб спагнанні аліментаў. І калі прымусіць гора-бацьку (або маці) любіць сваё дзіця дзяржаве не пад сілу, то, прынамсі, закон здольны спагнаць з яго (яе) матэрыяльныя сродкі на ўтрыманне сына або дачкі.

Эфектыўнасць механізма барацьбы з неплацельшчыкамі аліментаў ва ўсіх краінах свету паступова ўдасканальваецца. У ЗША, напрыклад, сёння злосныя неплацельшчыкі не маюць права працаваць па шэрагу прафесій, а таксама пазбаўляюцца правоў на кіраванне некаторымі відамі транспарту (як вынік, аліменты там выплачваюцца, паводле статыстыкі, больш чым у 90 % выпадкаў). А вось у Японіі аліменты з'яўляюцца выключна прыватнай справай пары, дзяржава ніяк не рэгулюе дадзенае пытанне. І пры гэтым працэнт бацькоў (як і ва ўсім свеце, у першую чаргу гэта бацькі: дзіця застаецца з маці), якія пасля разводу адмаўляюцца ўносіць грошы на ўтрыманне ўласнага сына ці дачкі, імкнецца да нуля. У Індыі праблем з аліментамі не ўзнікае з аб'ектыўнай прычыны: там амаль няма разводаў (распадаецца прыкладна 1 % пар, што бяруць шлюб). У шэрагу краін Еўропы практыкуецца фіксаваная стаўка на выплату аліментаў (яна складае ад 200 да 700 еўра штомесяц).

**«Пагадненне, якое прадугледжвае перадачу нерухомай маёмасці ва ўласнасць дзіцяці, падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі і з'яўляецца падставай для пераходу права ўласнасці на гэтую нерухомую маёмасць. Адзін раз аформіўшы такую здзелку, можна цалкам пагасіць свае аліментныя абавязацельствы перад дзіцем за ўвесь перыяд яго непаўналецця».**



У нашай краіне яшчэ адносна нядаўна механізм барацьбы з неплацельшчыкамі аліментаў наўрад ці можна было назваць эфектыўным. Напэўна, некаторыя жанчыны, якія перажылі развод гадоў 20 таму, памятаюць, як замест грошай на ўтрыманне дзіцяці атрымлівалі ад яго бацькі «тлумачэнні заяўніку» і ў рэшце рэшт вырашалі, што прасцей, чым «выбіць» аліменты, зарабіць на малога самой. Сёння, адзначаюць юрысты, механізм спагнання аліментаў у нашай краіне хоць і не дасканалы, але досыць эфектыўны. Аб нюансах заканадаўства, звязанага з налічэннем і атрыманнем аліментаў, распавядае **адвакат, член Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алена ГРОНСКАЯ**.

### АБ ПАМЕРЫ ВЫПЛАТ

***— Алена, у некаторых краінах аліменты на непаўналетніх дзяцей складаюць пэўную суму, а не залежаць ад заробку бацькі (або маці). Ці магчымы такі фармат у нашай краіне?***

— Па агульным правіле, аліменты на непаўналетніх дзяцей спаганяюцца ў працэнтных адносінах да заробку і (або) іншага даходу бацькоў у месяц, г. зн. у адпаведнасці з арт. 92 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і, — распавядае адвакат. — Аліменты на непаўналетніх дзяцей з іх бацькоў, калі іх памер не вызначаны Шлюбным дагаворам, Пагадненнем аб дзецях або Пагадненнем аб выплаце аліментаў, на адно дзіця складае 25 %, на двух дзяцей — 33 %, на трох і больш дзяцей — 50 % заробку і (або) іншага даходу бацькоў у месяц. Пры гэтым для працаздольных бацькоў мінімальны памер аліментаў у месяц павінен складаць не менш за 50 % на адно дзіця, 75 % — на двух дзяцей, 100 % — на трох і больш дзяцей бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

Разам з тым, бацькі маюць права вызначыць памер аліментаў Шлюбным дагаворам, Пагадненнем аб дзецях або Пагадненнем аб выплаце аліментаў. Пры недасягненні пагаднення бацькі могуць звярнуцца ў суд, кажа адвакат.

Дзеючым заканадаўствам прадугледжана таксама магчымасць спагнання аліментаў у цвёрдай грашовай суме або ў суме, якая адпавядае вызначанай колькасці базавых велічынь.

У якіх выпадках прымаецца такое рашэнне? У выпадках, калі бацькі, абавязаныя выплачваць аліменты, маюць нерэгулярны заробак і (або) даход, альбо атрымліваюць яго частку ў натуры (асобы, якія займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, члены сялянскай (фермерскай) гаспадаркі і г. д.), а таксама ў іншых выпадках, калі спагнанне аліментаў немагчымае або цяжкавыканальнае, тлумачыць Алена Гронская.

— Заканадаўствам (арт. 94 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і) прадугледжаны адкрыты пералік сітуацый, калі аліменты могуць быць спагнаныя ў цвёрдай грашовай суме, — дадае яна. — Напрыклад, адказчык атрымлівае нерэгулярны заробак і даход, які змяняецца: у адным перыядзе ён можа атрымаць значную суму, а ў іншым — наогул не мець ніякага заробку (нераўнамернае атрыманне грашовых сродкаў). На практыцы аліменты ў цвёрдай грашовай суме, якая выплачваецца штомесяц, могуць быць спагнаныя з асоб, якія з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, удзельнікамі гаспадарчых таварыстваў, заснавальнікамі прадпрыемстваў.

***— Як вызначаецца памер гэтай сумы?***

— Пры вызначэнні памеру аліментаў у цвёрдай грашовай суме суд аналізуе памер даходу плацельшчыка за год, папярэдні зварот істца ў суд, — распавядае адвакат. — Варта адзначыць, што пры вызначэнні памеру аліментаў суд не бярэ пад увагу памер заработнай платы і даходу атрымальніка аліментаў. У выпадку, калі бацька (маці), што плаціць аліменты, мае рэгулярны заробак, аліменты спаганяюцца па агульным правіле (на падставе арт. 92 Кодэкса аб шлюбе і сям'і).



### ЦІ МАГЧЫМА НЕ ПЛАЦІЦЬ?

***— Ці могуць бацькі самастойна вызначыць спосаб утрымання дзяцей, а таксама памер аліментаў?***

— Заключыўшы Пагадненне аб выплаце аліментаў, бацькі маюць права па сваім меркаванні вызначыць парадак і форму ўтрымання дзяцей, а таксама памер аліментаў, спосабы і парадак выплаты. У дагаворы можа быць прадугледжана спалучэнне розных спосабаў выплаты. Але памер аліментаў не павінен быць меншы, чым прадугледжана дзеючым заканадаўствам.

Пагадненне аб выплаце аліментаў заключаецца ў пісьмовай форме паміж тым з бацькоў, хто выплачвае аліменты, і іх атрымальнікам і абавязкова падлягае натарыяльнаму сведчанню, падкрэсліла адвакат.

— Але такое пагадненне не можа быць заключана, калі аліменты выплачваюцца ў адпаведнасці са Шлюбным дагаворам, Пагадненнем аб дзецях або судовай пастановай, у якіх ужо вырашаны пытанні выплаты аліментаў.

***— Ці існуе законны спосаб не плаціць аліменты?***

— Прызнаюся, у маёй адвакацкай практыцы нярэдкія выпадкі, калі па атрыманне юрыдычнай кансультацыі звяртаюцца ахвотныя знайсці спосаб ухіліцца ад выплаты аліментаў, — кажа Алена Гронская. — Адказваючы на пытанне «Як не плаціць аліменты?», я распавядаю аб спосабе, які не быў прадугледжаны раней дзеючым заканадаўствам. Гаворка ідзе пра навацыю заканадаўства Рэспублікі Беларусь, якая дае магчымасць пры заключэнні пагаднення аб дзецях перадаць маёмасць ва ўласнасць дзіцяці. Напрыклад, кватэру, дом, зямельны ўчастак і да таго падобнае. Пагадненне, якое прадугледжвае перадачу нерухомай маёмасці ва ўласнасць дзіцяці, падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі і з'яўляецца падставай для пераходу права ўласнасці на гэтую нерухомую маёмасць. Адзін раз аформіўшы такую здзелку, можна цалкам пагасіць свае аліментныя абавязацельствы перад дзіцем за ўвесь перыяд яго непаўналецця.

### КАЛІ ПАТРЭБНЫЯ ГРОШЫ...

Ці можа маці (або бацька) спагнаць з былога мужа (жонкі) дадатковыя сродкі на дзіця звыш аліментаў у цяжкай жыццёвай сітуацыі? Аказваецца, гэта магчыма. Бацькі, якія выплачваюць аліменты на непаўналетніх дзяцей, могуць быць прыцягнуты ў судовым парадку да ўдзелу ў дадатковых выдатках, выкліканых выключнымі абставінамі: цяжкая хвароба, калецтва дзіцяці, інваліднасць і г. д., падкрэслівае адвакат. Памер удзелу ў такіх выдатках вызначаецца судом у цвёрдай грашовай суме або ў суме, якая адпавядае вызначанай колькасці базавых велічынь, зыходзячы з матэрыяльнага і сямейнага становішча асобы, з якой спаганяюцца аліменты і асобы, якая атрымлівае іх. Паняцце «выключныя абставіны» можа насіць як часовы, так і пастаянны характар (напрыклад, гэта могуць быць выдаткі на ўтрыманне дзіцяці, выкліканыя неабходнасцю старонняга догляду, палепшанага харчавання, рэабілітацыйных мерапрыемстваў, санаторнага лячэння), кажа суразмоўніца.

— Суд мае права абавязаць бацькоў узяць удзел як у зробленых выдатках, так і ў выдатках, якія будуць неабходныя ў далейшым, — адзначае Алена Гронская.

Ну а на ўласнае ўтрыманне ці мае права адзін з былых сужэнцаў спаганяць з былога мужа (жонкі) грашовыя сродкі? Магчыма і гэта, але толькі ў сітуацыі, калі муж і жонка былі ў зарэгістраваным шлюбе. Асобы, якія знаходзіліся ў «грамадзянскім шлюбе», пазбаўленыя такой магчымасці, падкрэслівае адвакат.

— Права на ўтрыманне ў сужэнца ўзнікае пры наяўнасці наступных умоў: жонка ў перыяд цяжарнасці; сужэнец, які ажыццяўляе догляд агульнага дзіцяці да дасягнення ім трох гадоў, агульнага дзіцяці-інваліда да дасягнення ім васямнаццаці гадоў, агульнага непрацаздольнага дзіцяці; непрацаздольны сужэнец.

Абавязковымі ўмовамі тут з'яўляюцца патрэбы ў матэрыяльнай дапамозе і наяўнасць магчымасці даць утрыманне, кажа адвакат. Але шлюбным дагаворам могуць быць прадугледжаны і іншыя выпадкі, пры якіх адзін з сужэнцаў абавязаны будзе ў выпадку разводу аказваць матэрыяльную дапамогу другому.

Памер сродкаў на ўтрыманне сужэнца вызначаецца судом зыходзячы з матэрыяльнага і сямейнага становішча абодвух у кратным дачыненні да базавай велічыні, устаноўленай на момант выплаты. У выпадку змены матэрыяльнага або сямейнага становішча былых мужа і жонкі кожны з іх мае права звярнуцца ў суд з іскам аб змене памеру сродкаў, якія спаганяюцца на ўтрыманне.

— Заўважу, што права аднаго сужэнца на ўтрыманне ад іншага страчваецца, калі адпалі ўмовы, якія з'яўляюцца, згодна з законам, падставай для ўтрымання, а таксама калі разведзены сужэнец, што атрымлівае сродкі на ўтрыманне, уступіць у новы шлюб, — сказала адвакат.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ТРУС ГУКАЕ ВЯСНУ

## Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се СЯАЮН распавёў «Звяздзе» пра кітайскія знакі задыяка і Новы год

**— Напярэдадні Новага года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас інтэрв'ю падарыў вядучым тэлепраграмы «Добрай раніцы, Беларусь!» некалькі трусянят, сказаўшы аб тым, што трус з'яўляецца сімвалам 2023 года, і пажадаўшы здароўя і даўгалецця, міру і дабрабыту. Як пасол Кітая ў Беларусі я глыбока захапляюся разуменнем Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам кітайскай культуры і адчуваю шчырую радасць ад таго, што яе ў Беларусі любяць і шануюць, — заўважыў кітайскі дыпламат.**



### СВЕТЛЫ ШЛЯХ

— Сёлета 22 студзеня адзначаецца Свята вясны — першы дзень года Труса. Гэтае звяраня ў Кітаі лічыцца сімпатычнай, мілай жывёлай, яго вобраз мае багатыя культурныя канатацыі. З выгляду трус рахманы, мілы, наіўны і актыўны. Такія яго паводзіны маюць на ўвазе тое, што год будзе ўлагоджаны і выдатным, прынясе шчасце і здзяйсненне жаданняў, — адзначыў Се Сяаюн. — Па сваёй здольнасці трус спрытна скача, з лёгкасцю пераадольвае перашкоды, што азначае ўменне пераўзыходзіць сябе і пераадольваць цяжкасці. Як вядома, гэтая жывёла звычайна рыхтуе некалькі гнёздаў для хованкі. У Кітаі ёсць выраз «у хітрага зайца тры нары», што азначае розум, пільнасць і ўменне абараніць сябе. Калі казаць аб вымаўленні слова «трус» у кітайскай мове — «тую», то яно з'яўляецца амонімам слова «шлях», што азначае светлую будучыню, рэалізацыю вялікіх поспехаў.

Паводле старажытных кітайскіх легенд, на Месяцы жыве чарадзейны трус, белы, як нефрыт, з галавы да ног, і клічуць яго Юту — «Нефрытавы трус». Ён трымае нефрытавы таўкачык і цэлы дзень расцірае лекі. Звычайныя людзі, якія прынялі гэтыя лекі, могуць стаць бессмяротнымі, таму трус таксама прыносіць здароўе і даўгалецце. Кітайцы лічаць, што людзі, народжаныя ў розныя гады, маюць розныя характары. Той, хто нарадзіўся ў год Труса, як правіла, далікатны, добры, шчыры, нязмушаны і знаходлівы, сціплы і ветлівы, уважлівы да дэталяў і цярплівы, а таксама добрасумленны і адказны, гэта значыць, валодае адным з найлепшых характараў.

### ВЯЛІКІЯ ЧАСІНЫ

— Знакі задыяка таксама называюць каляндарнымі жывёламі года нараджэння, а менавіта «Цзы-Пацук», «Чоў-Бык», «Інь-Тыгр», «Маа-Трус», «Чэнь-Дракон», «Сы-Змяя», «У-Конь», «Вэй-Авечка», «Шэнь-Малпа», «Ю-Курыца», «Сюй-Сабака» і «Хай-Свіння». Існуе мноства легенд і паданняў аб парадку і паходжанні дванаццаці знакаў задыяка, — распавёў кітайскі дыпламат. — У адным з іх гаворыцца аб тым, што легендарны Нябесны імператар абраў дванаццаць жывёл у якасці знакаў задыяка і арганізаваў спаборніцтва па бегу. Кот папрасіў Пацука дапамагчы падаць яго заяўку на ўдзел, але той забыўся гэта зрабіць, так гэтыя жывёлы і сталі ворагамі. Бык быў самым стараннным, ён раней за ўсіх прачнуўся і накіраваўся ўдзельнічаць у спаборніцтве, думаючы, што першы. Але і не падазраваў, што Пацук ужо ўпотай залез на яго спіну, каб паспаць, а калі Бык ужо амаль дабраўся да фінішу, ён саскочыў і атрымаў першае месца. Свіння была самая лянівая і бегла павольней за ўсіх, таму яна змагла заняць толькі апошняе месца.

У дадатак да міфаў і легенд іншае больш рэалістычнае сцвярджэнне складаецца ў тым, што знакі задыяка з'явіліся ў выніку аб'яднання жыццёвага досведу старажытнай кітайскай земляробчай цывілізацыі. Дванаццаць знакаў задыяка спарадкавалі ў адпаведнасці з дванаццаццю «вялікімі гадзінамі» аднаго дня. Такім чынам, «шычэнь»: ноччу з 23.00 і да 1.00 наступнага дня — гэта першая «вялікая гадзіна» — час «Цзы». У гэты час пад покрывам ночы актыўна ходзяць пацукі, таму яго называлі «Цзы-Пацук». З 1.00 да 3.00 — час «Чоў». Быкі прывыкалі пасвіцца ўначы, і сяляне прачыналіся глыбокай ноччу, каб іх пакарміць, таму назвалі «Чоў-Бык». З 3.00 да 5.00 — час «Інь». Тыгры хаваюцца днём і лютуюць ноччу, старажытныя людзі часта ў гэты час чулі іх роў, таму называлі «Інь-Тыгр». Перыяд на світанку з 5.00 да 7.00 — гэта час «Маа». Трусы любяць есці траву з раніцай расой, адсюль і назва «Маа-Трус». З 7.00 да 9.00 раніцы — час «Чэнь». У гэты час часта назіраецца туман. Кітайская легенда распавядае, што цмок любіць катацца на аблоках і тумане, таму называлі «Чэнь-Цмок». З 9.00 да 11.00 надыходзіць час «Сы». Калі туман рассейваецца, змеі выпазаюць са сваіх нор у пошуках ежы, таму звалі «Сы-Змяя». З 11.00 да 13.00 — час «У». Апоўдні дзікія коні заўсёды бегаюць і ржуць, таму называлі «У-Конь». З 13.00 да 15.00 пасля апоўдня надыходзіць час «Вэй». У гэты час пастухі часта адпускаюць агароджу, каб пасвіць авечак, таму звалі «Вэй-Авечка». Прамежак з 15.00 да 17.00 называецца часам «Шэнь». У гэты час сонца глядзіць на захад, крычаць малпы, таму называлі «Шэнь-Малпа». З 17.00 да 19.00 — час «Юй». Калі сонца садзіцца, курыца кружыцца перад гняздом, таму называлі «Ю-Курыца». З 19.00 да 21.00 — час «Сюй». Людзі працавалі не складаючы рук увесь дзень, а пасля замыкалі дзверы і рыхтаваліся да адпачынку, а сабакі ляжалі перад дзвярыма, ахоўваючы ўваход, таму называлі «Сюй-Сабака». З 21.00 да 23.00 надыходзіў час «Хай». У начной цішыні можна было пачуць тое, як штурхалі свае карыты свінні, таму называлі «Хай-Свіння».

### ДВАНАЦЦАЦЬ СІМВАЛАЎ

— Колькі б ні было розных легенд пра паходжанне дванаццаці знакаў задыяка, адно несумненна: выбар гэтых духоўных «жывёл-сімвалаў» яскрава адлюстроўвае прыхільнасць кітайскай культуры да адзінства прыроды і чалавека, а таксама светаўспрыманне сяброўскага абыходжання з жывёламі і мірнага суіснавання, — падкрэсліў Се Сяаюн. — Як толькі сфарміравалася сістэма дванаццаці знакаў задыяка, яна не толькі аб'ектыўна адыграла ролю ў займальным летазлічэнні і ў кіраўніцтве вытворчасцю і паўсядзённым жыццём фермерскага грамадства, але і хутка спарадзіла багатыя і маляўнічыя культурныя і мастацкія выразы, якія ўзбагацілі кітайскую культуру.

Таксама існуе мноства легенд і паданняў, якія насамрэч улічвалі характэрныя асаблівасці розных жывёл, яны напоўнены мноствам алегорый. Пацук сімвалізуе бясконцае жыццё і росквіт. У старажытным Кітаі існаваў выраз: «Пацукі ў амбары — лішак збожжа ў доме». Сэнс гэтага выказвання ў тым, што, калі пацукі ўпотай з'елі збожжа ў нейкай сям'і, значыць, тут яго даволі, людзі жывуць у добрым здароўі. Бык з'яўляецца неад'емнай часткай традыцыйнай кітайскай фермерскай супольнасці. Кітайцы маюць глыбокую прыхільнасць да гэтай жывёлы, надзяляючы яе шматлікімі добрымі якасцямі, такімі як працавітасць, дабрыня, сумленнасць, прастата і гэтак далей. Тыгр — цар звяроў, ён з'яўляецца шчаслівым сімвалам адвагі, непахіснасці і аховы спакою. Дракон мае нязменны статус сярод кітайцаў. Яны называюць сябе «нашчадкамі дракона». У адрозненне ад заходніх драконаў, кітайскі з'яўляецца сімвалам шчаслівага прадвесця і высакароднасці. Змяя ідзе за драконам і вядомая як «маленькі дракон», сімвалізуючы настойлівасць і гнуткасць. Конь са старажытных часоў быў добрым сябрам чалавека. Ён сімвалізуе адвагу, стойкасць, вернасць і добрасумленнасць, а таксама ўвасабляе імкненне да мэты. Кітайцы таксама часта называюць людзей, якія валодаюць адмысловымі навыкамі ці здольнасцямі, «цяньліма», што значыць «хуткаходны скакун, які прабягае ў дзень 500 кіламетраў». Авечкі, рахманыя і добрасардэчныя, сімвалізуюць у кітайскай культуры ўрадлівы год, а таксама прыязнасць і мір, прыносяць багацце. Малпа разумная і пільная, надае вялікае значэнне сяброўству, любіць справядлівасць. Вядомы ў Кітаі і за мяжой Вялікі Мудрэц, Роўны Небу, Цар малпаў Сунь Укун, з'яўляецца такім тыповым вобразам. Курыца сімвалізуе адвагу і дбайнасць, а таксама ўвасабляе добрасумленны і скрупулёзны падыход да працы. Сабака — увасабленне вернасці, надзейнасці, працавітасці і адданасці справе, а свіння — пакорлівасць, прастата, шчодрасць і велікадушнасць. Дванаццаць знакаў задыяка не толькі ўвасабляюць спазнанне і ўспрыманне кітайскімі продкамі прыроды і саміх сябе, але таксама з'яўляюцца квінтэсэнцыяй мудрасці і мар кітайскага народа, поўныя імкнення да шчаслівага жыцця і пажаданняў дабрабыту.

### МАСТЫ СЯБРОЎСТВА

— Кітай усё больш і больш адкрываецца свету і выходзіць на глабальную арэну. На ўсіх кантынентах адзначаюцца кітайцы. Свята вясны паступова ператвараецца ў глабальнае свята. Дванаццаць знакаў задыяка таксама больш не з'яўляюцца проста кітайскай традыцыяй, а сталі мастом для сяброўскіх узаемаадносін кітайскага народа і народаў усяго свету. З таго часу, як Пошта Кітая выдала першы выпуск памятных марак «Залатая малпа» да Свята вясны 1980 года, які атрымаў шырокае прызнанне, Паўднёвая Карэя, Японія, Манголія і іншыя азіяцкія краіны таксама наперабой пачалі выпускаць серыі марак з выявамі жывёл кітайскага задыяка, а далей гэтая мода распаўсюдзілася ў Еўропе і ЗША. Цяпер кітайскія знакі задыяка даўно ўжо выйшлі з Азіі і набылі папулярнасць па ўсім свеце, іх ведаюць і любяць людзі ва ўсіх кутках планеты, у тым ліку і ў Беларусі.

Мінулы год быў годам Тыгра. Кітайска-беларускія адносіны чарговы раз павысілі сваю якасць і перайшлі на новы ўзровень на аснове існуючага добрага падмурка, здзейсніўшы гістарычны скачок. У верасні мінулага года Старшыня Сі Цзіньпін і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас двухбаковай сустрэчы ў Самаркандзе прынялі рашэнне павысіць кітайска-беларускія адносіны да ўзроўню ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, надаўшы новы імпульс кітайска-беларускаму супрацоўніцтву ў розных галінах. Упэўнены, што дзякуючы стратэгічнаму кіраўніцтву і агульнаму клопату кіраўнікоў двух дзяржаў, а таксама сумесным намаганням органаў улады і сяброў з розных колаў грамадства дзвюх краін, у Свята вясны года Труса кітайска-беларускае ўсепагоднае і ўсебаковае стратэгічнае партнёрства, несумненна, сустрэне яшчэ больш чароўную вясну, — пераканаы кітайскі дыпламат, — а кітайска-беларускае супрацоўніцтва ў розных галінах, несумненна, адкрые шырэйшыя перспектывы развіцця.

Падрыхтаваў **Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

### З нагоды

#### «АДНОСІНЫ МІНСКА І ПЕКІНА ВЫЙШЛІ НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ УСЕПАГОДНАГА І ЎСЕБАКОВАГА СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна са Святам Вясны, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Прыміце самыя цёплыя віншаванні з нагоды Свята Вясны. Мінулы год азнаменаваўся выдатнымі дасягненнямі і дастойнымі перамогамі Кітайскай Народнай Рэспублікі як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне, — адзначаецца ў віншаванні. — Увесь свет стаў сведкам яркіх зімовых Алімпійскіх гульняў у Пекіне, імклівых тэмпаў развіцця касмічнай праграмы Кітая, актыўнага прасоўвання ініцыятыў у галіне глабальнага развіцця і бяспекі, упэўненых крокаў на шляху да адраджэння вялікай кітайскай нацыі і пабудовы сацыялізму з кітайскай спецыфікай, а таксама гістарычных рашэнняў XX з'езда Камуністычнай партыі Кітая».

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія прынёс год Тыгра, мы сумеснымі намаганнямі змаглі дабіцца значных поспехаў у нарошчванні беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. «На палях саміта ШАС падпісаны вялікі пакет двухбаковых пагадненняў, якія адпавядаюць інтарэсам абедзвюх дзяржаў і дадуць магчымасць яшчэ больш умацаваць дружбу паміж нашымі краінамі. Адносіны Мінска і Пекіна выйшлі на новы ўзровень усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. — У індустрыяльным парку «Вялікі камень» дынамічна прасоўваецца праект у галіне традыцыйнай кітайскай медыцыны. Працягвае работу сумеснае прадпрыемства па зборцы легкавых аўтамабіляў «БЕЛДЖЫ».

Беларускі лідар запэўніў кітайскага калегу ў гатоўнасці разам і ў далейшым развіваць увесь комплекс беларуска-кітайскіх адносін, паглыбляць узаемадзеянне на міжнароднай арэне ў мэтах пабудовы справядлівага і мірнага глабальнага парадку. Аляксандр Лукашэнка запрасіў Сі Цзіньпіна наведаць Беларусь, дзе яго ведаюць і цэняць як сапраўднага сябра і дзе яму будзе аказаны самы цёплы і сардэчны прыём.

Навука

# Клетачная тэрапія для перамогі над ракам

**Навукоўцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта працуюць над тэхналогіяй атрымання рэкамбінантных бялкоў чалавека для прымянення іх у клетачнай тэрапіі ў барацьбе з ракам і аўтаімуннымі захворваннямі. Гэта распрацоўка стане прарывам у айчыннай медыцыне і дасць магчымасць замяніць дарагія імпартныя матэрыялы для інавацыйнай клетачнай тэрапіі і стварэння біямедыцынскіх прадуктаў на аснове дэндрытных клетак.**

Сёння ў сусветнай медыцыне выкарыстанне дэндрытных клетак з'яўляецца перспектыўным і абнадзейвае. Яны ўдзельнічаюць у супрацьпухлінным імунным адказе, дапамагаюць прадухіліць утварэнне метастазаў і рэцыдыў анкалагічнага захворвання. Клетачныя прадукты на аснове дэндрытных клетак выкарыстоўваюць як дапаўненне да хірургічнага лячэння, прамянёвай тэрапіі і хіміятэрапіі. На думку вучоных, іх сістэматычнае прымяненне ў тэрапіі дасць магчымасць дабіцца максімальнага эфекту пры лячэнні. Таксама клетачная тэрапія прымяняецца пры аўтаімунных захворваннях, напрыклад, пры дэрматыце, ваўчанцы, псарыязе, розных запаленчых працэсах.

Сёння айчынная медыцына выкарыстоўвае замежныя рэкамбінантныя чалавечыя цытакіны (бялкі, якія рэгулююць імунны адказ арганізма). Высокі кошт, працягласць пастаўкі, рызыка парушэння ўмоў іх захоўвання, страта біялагічнай актыўнасці памяншаюць магчымасць іх выкарыстання. Беларускія біёлагі працуюць над імпартазамяшчэннем кампанентаў для біямедыцынскіх клетачных прадуктаў.

Праект выконваюць супрацоўнікі навукова-даследчай лабараторыі біятэхналогіі біялагічнага факультэта БДУ пад кіраўніцтвам загадчыка Максіма Патаповіча. Біёлагі на дадзеным этапе працуюць над тэхналогіямі атрымання трох рэкамбінантных бялкоў чалавека: ГМ-КСФ, ІЛ-4 і ФНВ-α. Асноўнымі іх уласцівасцямі з'яўляецца рэгуляцыя імунных рэакцый, зніжэнне запаленчага працэсу і прыцягненне імунных клетак.

«Мы ўжо маем багаты досвед атрымання бялкоў жывёл, ідэнтычных прыродным. Мы выпускаем вялікую лінейку ветэрынарных прэпаратаў на іх аснове. Таму часткова біятэхналогіі і працэсы адпрацаваны. Спачатку мы вывучаем бялок чалавека. Ведаючы ўсё аб яго ўласцівасцях і структуры, штучна ствараем ідэнтычны яму, убудоўваем у бактэрыю і выкарыстоўваем яе для сінтэзу неабходнага бялку. Завяршаецца працэс аддзяленнем, ачысткай і вызначэннем актыўнасці субстанцыі. У выніку атрымліваем чысты бялок, на аснове якога можна распрацоўваць клетачныя прадукты. У далейшым яго плануецца выкарыстоўваць у Інстытуце біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі для стварэння клетачных прадуктаў на аснове дэндрытных клетак», — тлумачыць Максім Патаповіч.

Работа над тэхналогіяй выконваецца ў рамках дзяржаўнага задання. Завяршыць работу вучоныя ўніверсітэта плануюць у 2025 годзе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Навінкі кнігавыдавецтва

# АД «НЕСЦЕРКІ» ДА «КІМА»

**У Выдавецкім доме «Звязда» ёсць кніжная серыя «Школьная бібліятэка класікі», у якой выходзяць творы, адрасаваныя школьнікам і настаўнікам, творы, якія ўваходзяць у праграму пазакласнага альбо дадатковага чытання, творы, якія вывучаюць у тым ліку і па праграме. Кнігі з дадзенага праекта, у адрозненне ад блізкай па назве серыі — «Школьная бібліятэка», што трапляе толькі ў бібліятэкі агульнаадукацыйнай школы, можна набыць ва ўсіх кнігарнях краіны.**

Навінка са «Школьнай бібліятэкі класікі» — зборнік з дзвюх п'ес — неўміручай «Несцеркі» Віталя ВОЛЬСКАГА і вядомага меладраматычнага твора «Кім» Аляксея ДУДАРАВА. Наклад выдання — 2000 экзэмпляраў.




Нагадаем, што п'еса В. Вольскага напісана ў 1940 годзе. Першая пастаноўка адбылася на гастролях БДТ-2 у самы пярэдадзень Вялікай Айчыннай вайны — 18 мая 1941 года ў Петразаводску. У 1946 годзе пастаноўка адзначана Сталінскай прэміяй. Экранізавана п'еса ў 1955 годзе. Камедыя «Несцерка», якая заснавана на матэрыяле беларускіх народных казак, паказвае народнага самародка Несцерку, здольнага абдурыць паноў і заўсёды гатовага прыйсці на дапамогу простаму люду. На сцэне ролю галоўнага героя п'есы выконвалі вядомыя беларускія акцёры — Аляксандр ІЛЫНСКІ і Фёдар ШМАКАЎ (амаль паўвека Несцерка быў шмакаўскім!). Што датычыць экранізацый, то ў «Несцеркі» іх было ажно тры — у 1955, 1980 і 2013 гадах...

П'еса лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, прэміі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі ў галіне літаратуры і мастацтва Аляксея Дударава «Кім» — пра падлетка, які шукае сродкі, каб вылечыць сваю названую сястру ад цяжкай хваробы. Вельмі драматычны і цікавы, напружаны, дынамічны твор.

Сёлета ў Выдавецкім доме «Звязда» ўсяго запланаваны да выхаду чатыры кнігі ў серыі «Школьная бібліятэка класікі».

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора, директора ООО «Правовая Стратегия»** (220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404, п/я 34)

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОБОРУДОВАНИЯ**

**КУП «Червенский деревообрабатывающий комбинат»** (223232, Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71)
**в составе:**

Лот № 1: **станок сверлильно-присадочный многоголовочный Griggio G65/5T, 2013 г. в., инв. № 99-9, находится по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71**.
Начальная цена с НДС (20 %) – **4 482,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **448,00** бел. руб.

Лот № 2:
• **административное здание** *(составные части и принадлежности: навес, 2 (две) пристройки, забор)* **с инв. № 615/С-16029 общ. пл. 385,2 кв. м.** *Объект обременен договором ипотеки;*
• **проходная с инв. № 615/С-16277 общ. пл. 14 кв. м;**
• **многолетние насаждения (41 шт.).**
**Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 625850100001003969** *(право постоянного пользования)* **площадью 0,2069 га, по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71.**
Начальная цена с НДС (20 %) – **86 616,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **8 661,00** бел. руб.
*Начальная цена лотов снижена на 55 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55 BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Условия аукциона по лоту № 1: работоспособность узлов и агрегатов не проверялась, при инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Все мероприятия по снятию с учета в органах Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 30.07.2022, 24.09.2022, 10.11.2022, 09.12.2022.

Аукцион состоится **01.02.2023 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **31.01.2023** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра 029 335 74 49.**

УНП 600003899

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому городскому филиалу Гродненского областного потребительского общества**

**Аукцион состоится 14.02.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **ЛОТ 1: легковой автомобиль седан PEUGEOT 406, 1998 года выпуска, объём 2.0, дизель, серебристый металлик, регистрационный номер 5765 MX-4, номер кузова (рамы) VF38BRHZE80665680, пробег 438 000** |
| **Начальная цена продажи** | 3 798,00 руб. (три тысячи семьсот девяносто восемь рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 379,00 руб. (триста семьдесят девять рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 10 февраля 2023 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 22.11.2022 г. | |
| Условия проведения аукциона: оплату приобретаемого объекта производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь; расходы по заключению договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя; право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты; документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества**
**ОАО «Могилевхимволокно»**

**Аукцион состоится 07.02.2023 в 12.00**
**по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**

Лот № 1 –
**Капитальное строение с инв. 700/С-49636 – Машиносчетная станция и АТС,**
площадь – 1008,6 кв. м, расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000003006368 (площадь 0,2141 га, право аренды) по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Челюскинцев, 87.
**Тротуар-дорожка от центральных ворот и ограждение здания МС и АТС**
(инв. №№ 2070202010, 2030098900).

***Начальная цена продажи: 70 250,33 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка 7 025,03 бел. руб.***

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901.

Срок подачи документов для участия в аукционе: по 06.02.2023 до 11.00.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

**ООО «СпецРеализация»**
**объявляет о проведении третьих повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества**
**СООО «Компания Офисный Комфорт»**
(УНП 800017250, г. Слуцк, ул. Стародорожская, д. 22А),
**находящегося в процедуре ликвидации.**

**Дата и время проведения торгов: 01 февраля 2023 года.**
**Начало – 10.00. Заявки принимаются с 21 января 2023 года по 30 января 2023 года.**
**Место проведения торгов: г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».**
**Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.**
**Продавец: СООО «Компания Офисный Комфорт» (УНП 800017250) в лице ликвидатора – заместителя директора ООО «Бизнес Энджелс Групп» Михайловой Светланы Анатольевны.**
Шаг торгов – 5 %. Задаток – 5 %.
Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на сайте http://www.specrealization.by. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 218 (29840) за 05.11.2022. РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 249 (29871) за 20.12.2022.РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 3 (29883) за 06.01.2023.

Маральныя калізіі

# БІЯЭТЫКА І НАВУКОВЫ ПРАГРЭС

## Як прынцып «не нашкодзь» можна рэалізаваць у медыцынскай генетыцы?

**Якія біяэтычныя праблемы цягне за сабой бескантрольны прагрэс у развіцці медыцынскіх тэхналогій? Як далёка можна заходзіць у генетычных даследаваннях? Чым пагражае нам далейшае развіццё лічбавай медыцыны? Як павінна развівацца сістэма біяэтычнай адукацыі і якую ролю адыгрывае біяэтыка ў станаўленні маладога вучонага? Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні шукалі ўдзельнікі Рэспубліканскага форуму «Біяэтычны ўніверсітэт». Ён стаў заключным мерапрыемствам праекта Рэспубліканскага цэнтра біяэтыкі БелМАПА, які быў рэалізаваны пры падтрымцы ЮНЕСКА і пад патранажам Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА. Форум сабраў прадстаўнікоў розных медыцынскіх арганізацый і рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў, прадстаўнікоў медыцынскіх універсітэтаў, студэнтаў і аспірантаў, зацікаўленых у развіцці і распаўсюджванні біяэтычных ведаў. Удзел у форуме ўзялі таксама вядомыя вучоныя і практычныя дзеячы ў сферы біяэтыкі з Масквы, Казахстана і Кыргызстана.**

### ДЫСКУСІЙНЫЯ ПЫТАННІ

Біяэтыка з'яўляецца міждысцыплінарнай дысцыплінай, якая ўтварылася на перакрыжаванні многіх абласцей сучасных ведаў: філасофіі, медыцыны, біялогіі, экалогіі, псіхалогіі, права і гэтак далей. Тэрмін «біяэтыка» ўвайшоў ва ўжытак у самым пачатку 70-х гадоў XX стагоддзя. Амерыканскі вучоны, біяхімік Ван Рэнсэлер Потэр вызначыў яе як дысцыпліну, якая спалучае біялагічныя веды з ведамі аб чалавечых каштоўнасцях. Сёння біяэтыка шукае адказы на шматлікія выклікі часу. Адбываецца дыялог паміж прадстаўнікамі розных ведаў. Не сакрэт, што магчымасці медыцыны, прававыя нормы і маральныя каштоўнасці могуць не супадаць, а часам нават знаходзяцца ў супярэчнасці. Менавіта таму час ад часу і разгараюцца публічныя дыскусіі па многіх вострых момантах.

**«Каля 95 працэнтаў спадчынных захворванняў не маюць метадаў лячэння».**

Спектр пытанняў, якімі займаецца біяэтыка, вельмі шырокі. І яны ніколі не заканчваюцца, бо медыцынскія тэхналогіі, асабліва ў галіне генетыкі і трансплантalогіі, увесь час ідуць наперад. І кожны раз, ацэньваючы новае дасягненне навукі, трэба адказаць на пытанне, ці не нашкодзіць яно людзям? Пошукам адказаў займаецца шырокае кола экспертаў: урачы, біёлагі, вучоныя, юрысты, святары розных канфесій, грамадскія дзеячы, палітыкі, журналісты, эканамісты. Складаных з этычнага пункта гледжання сітуацый узнікае вельмі шмат, і яны разнастайныя, як само жыццё. Разам з тым любая памылка ў новых тэхналогіях можа дыскрэдытаваць гэтую тэхналогію і адкінуць навуку назад на дзесяцігоддзі. Дык як не перайсці мяжу дазволенага?

Відавочна, што генетыка аказала значны ўплыў не толькі на развіццё біямедыцыны, але і на ўяўленні аб тым, што такое чалавек і наколькі дапушчальна ўмешвацца ў яго прыроду. У кантэксце павароту да персаналізаванай медыцыны пашыраецца значэнне генетычных ведаў. Практычна кожны чалавек альбо ўжо сутыкнуўся, альбо ў найбліжэйшай будучыні сутыкнецца з генетычнай дыягностыкай, генетычным кансультаваннем, а хтосьці — і з генатэрапіяй.

Шмат вострых этычных пытанняў звязана са сферай рэпрадукцыі чалавека, у прыватнасці з прэімплантацыйнай генетычнай дыягностыкай. Напрыклад, ці дапушчальны адбор эмбрыёнаў нагогул або па нейкіх прыкметах і ці не прыйдзем мы такім чынам увогуле да «дызайну дзяцей», адбору і нараджэнню найбольш генетычна дасканалых?

### КРЫТЭРЫЙ ДАСТУПНАСЦІ

— Генетыка сёння звязана з новымі магчымасцямі дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі, — разважае **Алена ГРАБЕНШЧЫКОВА, доктар філасофскіх навук, загадчык кафедры біяэтыкі Расійскага нацыянальнага даследчага медыцынскага ўніверсітэта імя М. Пірагова, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках РАН.** — У Навуковым цэнтры акушэрства, гінекалогіі і перынаталогіі імя У. Кулакова ў 2020—2022 гадах рэалізоўваўся пілотны праект па ацэнцы магчымасцяў пашырэння неанатальнага скрынінгу. Гэта магутны цэнтр, дзе нараджаюцца да 10 тысяч немаўлят штогод. І з дапамогай інфармаванай згоды там удалося дабіцца высокага працэнта ўцягвання бацькоў немаўлят у скрынінг. Бацькам прапанавалі адказаць, а якую генетычную інфармацыю пра сваё дзіця яны самі хацелі б ведаць?

Трэба заўважыць, што цяпер скрынінг новаароджаных праводзіцца больш як у 50 краінах свету. У Расіі ён быў уведзены ў 2006 годзе на пяць захворванняў. А з 2023 года гэта будзе ўжо 36 назалогій, уключаючы складаныя імунадэфіцытныя станы і спінальна-мышачную атрафію. Пры гэтым у шэрагу суб'ектаў Расійскай Федэрацыі і раней тэсціраванне праводзілася на большую колькасць спадчынных хвароб. Аднак здараецца, што бацькі адмаўляюцца ад скрынінгу, лічаць яго непатрэбным эксперыментам.

У ЗША разам з рэкамендаванай адзінай скрынінгавай панэллю, якая ўключае 34 асноўныя і 26 другасных станаў, асобныя штаты рэалізоўваюць праграмы пашыранага скрынінгу. У яго ўключаюць захворванні, арыентуючыся на наступныя крытэрыі. Першы — даказаная карысць выяўлення гэтага захворвання да з'яўлення клінічных прыкмет і дыягностыкі. Другі — наяўнасць магчымасці для правядзення тэста і далейшага медыцынскага суправаджэння пацыента. Трэці — існаванне эфектыўных спосабаў лячэння.

Гэтыя крытэрыі аналагічныя прынцыпам ацэнкі праграм скрынінгу, што былі распрацаваныя ў 1968 годзе па запыце Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Дж. Уілсанам і Г. Юнгнерам: захворванне павінна быць сур'ёзным парушэннем стану здароўя, павінна быць магчымасць лячэння гэтай хваробы, узгодненая палітыка ў адносінах да катэгорый пацыентаў, што накіроўваюцца на лячэнне. Агульныя выдаткі на выяўленне выпадкаў хваробы павінны быць эканамічна збалансаваны ў адносінах да медыцынскіх выдаткаў у цэлым, выяўленне выпадкаў хваробы павінна быць працэсам бесперапынным, а не аднаразовым і гэтак далей.

Нягледзячы на тое, што гэтыя прынцыпы вытрымалі выпрабаванне часам і застаюцца вельмі карыснымі, з'явілася меркаванне, што некаторыя крытэрыі мэтазгодна было б абнавіць. Так, крытэрый даступнасці лячэння з'яўляецца для Уілсана і Юнгнера самым важным.

### «ДЫЯГНАСТЫЧНАЯ АДЫСЕЯ»

«Аднак каля 95 працэнтаў спадчынных захворванняў не маюць метадаў лячэння, — звяртае ўвагу Алена Грабеншчыкова. — Па даных даследавання, праведзенага EURORDIS (гэта неўрадавы альянс пацыенцкіх арганізацый з больш чым 60 краін. — **Аўт.**), 25 працэнтаў пацыентаў, якія пакутуюць на рэдкія захворванні, пачулі свой дыягназ толькі праз 5—30 гадоў з моманту першага звароту да ўрача, і на працягу гэтага часу ў 40 працэнтаў з іх было памылкова дыягнаставана іншае захворванне. «Дыягнастычная адысея» — так называюць перыяд ад з'яўлення першых сімптомаў захворвання да выяўлення яго прычыны і пастаноўкі дакладнага дыягназу. Ён можа працягвацца ад некалькіх месяцаў да дзясяткаў гадоў». Нярэдка ў Маскву з рэгіёнаў трапляюць дзеці, якім ставілі адзін памылковы дыягназ за іншым, пакуль тыя не трапілі да генетыкаў».



NGS (метад секвеніравання новага пакалення. — **Аўт.**) дазваляе атрымаць мноства даных, якія валодаюць рознай ступенню верагоднасці, рознай ступенню дакладнасці і значнасці (экзом даследуецца на тысячу спадчынных захворванняў). Дык якую ж інфармацыю неабходна раскрываць бацькам? Да нядаўняга часу ва ўсім свеце шырока падтрымлівалася меркаванне, што непаўналетніх варта правяраць толькі на раннія расстройствы, для якіх існуюць варыянты лячэння або прафілактыкі, да таго часу, пакуль дзіця не зможа прымаць уласныя рашэнні і зрабіць свой выбар. Прыхільнікі гэтай пазіцыі казалі, што не варта правяраць дзіця на генетычныя захворванні з познім пачаткам і тым самым пазбаўляць яго права на адкрытую будучыню... Захворванне праявіць сябе значна пазней, а вырашаць — прыняць такое дзіця ці адмовіцца ад яго — бацькі будуць цяпер.

Але наколькі апраўдана такая этычная пазіцыя ў эпоху, калі генетычнае тэсціраванне ахоплівае ўвесь геном? Да таго ж абмежавальны падыход можа стаць нерэальным у найбліжэйшай будучыні, калі секвеніраваць увесь геном будзе больш танна, чым асобныя гены.

Генетычныя захворванні небяспечныя тым, што ў большасці выпадкаў выяўляюцца не адразу — сімптомы нарастаюць паступова, а дыягнаставаць захворванне без правядзення генетычнага аналізу немагчыма. Менавіта таму пачатак лячэння ў такіх пацыентаў нярэдка спазняецца, а значыць, яно менш эфектыўнае. Менавіта таму патрэбны неанатальны скрынінг. Дзякуючы яму лячэнне пачынаецца на самай ранняй, яшчэ бессімптомнай стадыі захворвання.

### ЭФЕКТ АД СКРЫНІНГУ

Разам з тым існуе пазіцыя, паводле якой, зыходзячы з інтарэсаў будучых пакаленняў, трэба ведаць аб наяўнасці генетычных паломак і прымаць адпаведныя крокі для прадухілення захворвання ў нашчадкаў. І зноў пытанне: інфармаванне павінна адбывацца толькі ў інтарэсах дзіцяці ці ўсё ж такі трэба ўлічваць інтарэсы ўсёй сям'і?

Алена Грабеншчыкова расказала, што адна з найбольш вядомых і паспяховых праграм генетычнага скрынінгу на схаванае носьбіцтва мутацый звязана з дзейнасцю арганізацыі «Дор Ешарым» (Dor Yeshorim) і накіравана на недапушчэнне распаўсюджвання хваробы Тэя-Сакса. Яна была створана ў 1983 равінам Дж. Экштэйнам, чацвёра дзяцей якога памерлі ад гэтай хваробы ў раннім узросце. Арганізацыя была звязана з хасідскай яўрэйскай абшчынай Нью-Ёрка, а затым ахапіла іншыя артадаксальныя абшчыны горада. У наступныя гады ў праграму былі ўключаны аналагічныя супольнасці з ЗША, Канады, Еўропы, Ізраіля і Аўстраліі.

**«Дыягнастычнай адысеяй» называюць перыяд ад з'яўлення першых сімптомаў захворвання да выяўлення яго прычыны і пастаноўкі дакладнага дыягназу».**

Калі да пачатку праграмы ў спецыяльным дзіцячым аддзяленні Яўрэйскага медыцынскага цэнтра Кінгсбрук у Брукліне (Нью-Ёрк, ЗША) знаходзілася да 16 пацыентаў з гэтым захворваннем і частка хворых дзяцей была ў спісе чакання, то ў 1996 годзе ніводнага дзіцяці ў гэтым аддзяленні ўжо не было. За час дзейнасці арганізацыі нормай стала практыка звароту па генетычную кансультацыю пары, калі высвятляецца, што ў сям'і патэнцыяльнага партнёра ёсць сваякі з генетычнымі захворваннямі.

«Паспяховасць скрынінгу «Дор Ешарым» можна патлумачыць сацыякультурным кантэкстам. Скрынінг быў распрацаваны з улікам рэлігійных традыцый і сацыякультурных асаблівасцяў артадаксальнай яўрэйскай абшчыны, члены якой прытрымліваюцца строгіх рэлігійных абрадаў, клапоцяцца аб сваім здароўі, маюць цвёрдыя перакананні адносна сям'і і моцна занепакоеныя генетычнай стыгматызацыяй, — звяртае ўвагу Алена Грабеншчыкова. — Большасць дзяўчат выходзяць замуж ва ўзросце каля 18 гадоў, большасць юнакоў — ва ўзросце каля 20 гадоў. Нягледзячы на «арганізаваны шлюб», у пары ёсць рэальны выбар: дзяўчына ці хлопец могуць адмовіцца ад прапанаванага партнёра. У артадаксальных колах спатканні адбываюцца толькі для пошуку партнёра для шлюбу. Яго асноўнай мэтай з'яўляецца стварэнне вялікай сям'і, а таму інфармацыя аб здароўі кожнага партнёра і сямейных генетычных захворваннях мае асаблівае значэнне».

Сёння ў медыцынскай супольнасці і ў грамадстве няма аднназначнага меркавання, ці трэба паведамляць пацыентам пра генетычныя захворванні, якія не лечацца.

— Лічу, што трэба, — падкрэслівае Алена Грабеншчыкова. — Таму што веданне лепшае за няведанне. Людзі, якія ў пошуках дыягназу збіліся з ног, больш не шукаюць яшчэ адно меркаванне, не трацяць вялікія грошы на абследаванні і атрымліваюць дапамогу ад пацыенцкіх арганізацый, якіх цяпер даволі многа. Галоўнае — яны могуць планаваць будучыню сям'і. А бацькі, у якіх нарадзілася ўжо не адно хворае дзіця, кажуць: «Калі б мы ведалі раней...» Асабліва такія веды актуальныя для народаў, для якіх нормай з'яўляюцца вялікія сем'і з мноствам дзяцей.

### ПРАВА ВЕДАЦЬ

У генетыцы ёсць такія паняцці, як «рэпрадуктыўнае планаванне» і «рэпрадктыўнае адзінства». Добра, калі пара з'яўляецца рэпрадуктыўным адзінствам. Але меркаванні па гэтым пытанні таксама разыходзяцца. Напрыклад, калі ў кагосьці ў пары выяўляецца генетычная мутацыя, ці трэба паведамляць пра гэту партнёру? Ці мае права ён пра гэта ведаць? З іншага боку, калі інфармацыяй валодаюць абодва партнёры, яны прымаюць сумеснае ўсвядомленае рашэнне яшчэ да зачацця дзіцяці, разумеючы і ацэньваючы рызыку. Гэта прынцыпова іншая сітуацыя ў адрозненне ад той, калі пра генетычнае захворванне становіцца вядома ўжо падчас цяжарнасці і трэба прымаць складанае маральнае рашэнне — рабіць аборт ці нараджаць хворае дзіця.

Валодаючы ўсёй інфармацыяй, можна прыбегнуць да розных варыянтаў, напрыклад, выкарыстаць донарскія гаметы, устрымацца ад нараджэння дзяцей, генетычна звязаных хоць бы з адным з партнёраў, зачаць дзіця шляхам экстракарпаральнага апладнення (ЭКА) і скарыстацца прэімплатацыйным генетычным тэсціраваннем (ПГТ), каб адабраць здаровы эмбрыён.

Увогуле, ёсць меркаванне, што зусім хутка ўвесь цывілізаваны свет пяройдзе да ўсвядомленага зачацця дзіцяці па-за целам чалавека з ужываннем прэімплантацыйнага генетычнага тэсціравання эмбрыёна. Прыхільнікі такой пазіцыі параўноўваюць натуральнае зачацце з гульнёй у рулетку. А дыягностыка храмасомных анамалій з'яўляецца найважнейшым складнікам інавацыйных рэпрадуктыўных тэхналогій. Без ПГТ сёння не абыходзіцца ніводнае планаванне цяжарнасці ў рамках пратакола экстракарпаральнага апладнення, што дазваляе істотна павысіць эфектыўнасць самой працэдуры.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СІМВАЛЫ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

## Чаму беларусы ніколі не змірацца з тым, што ў Еўропе зносяцца помнікі воінам-вызваліцелям, і што робіцца для таго, каб імя салдата, які доўгі час лічыўся зніклым без вестак, было вернута сваякам

**У той час, як у краінах, якіх мы называем суседзямі, фальсіфікуюцца падзеі Другой сусветнай вайны, разбураюцца помнікі воінам-вызваліцелям, а адпаведна, падрываюцца маральныя ўстоі грамадства, у Беларусі свята захоўваецца памяць аб найбольш трагічным перыядзе ў сусветнай гісторыі. У кожным раёне — помнікі, абеліскі, мемарыялы, якія сведчаць аб тым, колькі пакут прынеслі нацысты на беларускую зямлю. Прычым усе яны — у добрым стане: і абсалютна няважна, знаходзяцца памятныя знакі на цэнтральнай плошчы горада або ў лесе, на месцы былой вёскі, якую фашысты бязлітасна сцерлі з геаграфічнай карты. Больш за тое, мы не толькі шануем і даглядаем тыя пастаменты, якія ў нас ужо даўно ёсць. Мы ўзводзім новыя сімвалы нашай гістарычнай памяці, якая з кожным годам толькі мацуецца і перадаецца з пакалення ў пакаленне.**



Помнік ахвярам генацыду ў Чонкаўскім лесе пад Гомелем.

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.



У дэбютным выпуску нашага новага праекта «Абеліскі параненай зямлі» мы пагутарылі з **начальнікам упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войн Узброеных Сіл палкоўнікам Сяргеем ВАРАНОВІЧАМ**, які расказаў, колькі воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр войн знаходзіцца на дзяржаўным уліку, хто за іх адказвае. Акрамя таго, пагаварылі пра дзейнасць унікальнага падраздзялення — 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Узброеных Сіл, які праводзіць вялікую работу па выяўленні няўлічаных пахаванняў воінаў і мірных жыхароў, вяртае імёны з небыцця — гэтым самым скарачаючы спіс тых, хто лічыцца зніклым без вестак.

***— Сяргей Мікалаевіч, вы, як чалавек ваенны, напэўна, эмоцыі праяўляеце нячаста. Аднак ці можна змірыцца з тым, як здзекуюцца з памяці савецкіх воінаў у еўрапейскіх краінах?***

— Улады, якія змагаюцца з помнікамі, на мой погляд, адчуваюць сваю слабасць. Знішчаючы абеліскі і мемарыялы, яны паказваюць сваю ўяўную перавагу перад кімсьці, бо іншых спосабаў не знаходзяць. І калі прыбіраюцца памятныя знакі — паўбяды, але ж апаганьваюцца месцы, дзе знаходзяцца астанкі людзей, — гэта ўвогуле блюзнерства. Гэтыя людзі або не ведаюць гісторыі, або проста не разумеюць, што робяць. У Рэспубліцы Беларусь, Расійскай Федэрацыі такое нават уявіць немагчыма. Наадварот, жыхары нашых краін, калі ведаюць аб няўлічаных пахаваннях, усё робяць для таго, каб гэта месца было як мінімум абазначана. Праз беларускую зямлю прайшлі шматлікія войны. І гэта не толькі Вялікая Айчынная. Да нашай тэрыторыі мелі дачыненні і падзеі 1812 года, найбольш крывапралітныя баі Першай сусветнай вайны адбыліся менавіта на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Увекавечанне памяці загінулых, якія абаранялі сваю Айчыну ў розныя гістарычныя перыяды, даніна павагі да іх — адметная рыса беларусаў. Таму, вядома, мы ніколі не змірымся з тым, што адбываецца ў тых краінах, дзе зносяцца помнікі салдатам-вызваліцелям.

***— У зоне адказнасці ўпраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войн — вядзенне ўліку воінскіх пахаванняў...***

— Усе яны — а гэта больш як 8300 воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр войн шматлікіх гістарычных перыядаў — знаходзяцца пад аховай дзяржавы. Штогод сумесна з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі наша ўпраўленне ставіць на дзяржаўны ўлік каля 100—120 воінскіх пахаванняў. Гэта вялізная работа, якая яшчэ раз сведчыць аб тым, што жыхары Беларусі неабыякавыя да сваёй гісторыі. Людзі памятаюць аб тых падзеях і не жадаюць, каб тое, што адбылося на нашай зямлі звыш васьмі дзесяцігоддзяў таму, калі-небудзь паўтарылася.

***— У якім рэгіёне Беларусі найбольшая колькасць воінскіх пахаванняў?***

— Вялікая колькасць баёў адбылася ў 1943—1944 гады, калі лінія судакранання паміж бакамі, якія ваявалі, трымалася каля дзевяці месяцаў і калі пачалася беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Найбольшая колькасць воінскіх пахаванняў знаходзіцца ў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Мінскай абласцях.

***— Колькі ў нашай краіне помнікаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны?***

— Звыш 7200 помнікаў. Больш як 5600 з іх устаноўлена на пахаваннях воінаў Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі, звыш 1600 помнікаў увекавечвае памяць мірнага насельніцтва, якое загінула ў выніку злачыннай дзейнасці акупантаў. За кожным пахаваннем мясцовымі ўладамі замацаваны адказныя. Як правіла, гэта прадпрыемствы, калгасы, арганізацыі, установы адукацыі. Усе пахаванні знаходзяцца пад нашым кантролем. Штогод да 9 Мая або 3 ліпеня адміністрацыі райвыканкамаў інфармуюць нас аб тым, у якім стане на дадзены момант знаходзіцца кожнае пахаванне ў іх раёне. Дарэчы, на добраўпарадкаванне пахаванняў і падтрыманне іх у належным стане дзяржавай выдзяляюцца грашовыя сродкі. Адна з тэндэнцый апошняга часу — устанаўленне на воінскіх пахаваннях QR-кодаў, дзякуючы якім можна даведацца гісторыю канкрэтнага пахавання. Такі інфармацыйны складнік проста неабходны сучаснаму чалавеку, які жадае на месцы даведацца аб тым, што ён убачыў.

***— Улічваючы, што расследаванне па крымінальнай справе аб генацыдзе ў дачыненні да беларускага народа працягваецца, а адпаведна, выяўляюцца новыя ахвяры нацысцкага рэжыму, помнікаў стане яшчэ больш...***

— Ахвяр генацыду мы перазахоўваем у тыя пахаванні, дзе ўжо спачываюць мірныя жыхары. Калі гэта вялікі ўчастак, дзе пахавана адна і больш ахвяр, абазначаем межы пахавання, не падымаючы астанкі. Перавага аддаецца ўзбуйненню тых пахаванняў, якія ўжо ёсць, а не памнажэнню новых. Выканаўчыя і распарадчыя органы ўлады па тэрытарыяльным прынцыпе імкнуцца знойдзеныя астанкі падзахоўваць ва ўжо створаныя пахаванні. Аднак пажадана, каб гэта было ў межах аднай тэрытарыяльнай адзінкі. Падобныя пытанні ў любым выпадку ўзгадняюцца з намі, каб не было такога, што воін або ахвяра вайны загінулі ў адной мясцовасці, а пахавалі іх у іншым раёне. Гэта, напэўна, будзе гістарычна няправільна.

***— Ці з'явіцца адзіны помнік ахвярам генацыду беларускага народа?***

— У нас створана міжведамасная камісія па ўвекавечанні памяці ахвяр генацыду беларускага народа, якую ўзначальвае Міністэрства абароны. Я з'яўляюся намеснікам старшыні гэтай камісіі. Адно з пытанняў, якімі займаецца камісія, звязана са стварэннем адзінага мемарыяльнага помніка (знака), прысвечанага ахвярам генацыду. Спачатку мы планавалі, што створым яго на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Аднак камісія паглядзела, што ва ўсіх абласцях, дзе адбываліся гэтыя жудасныя здзекі з мірных грамадзян, ёсць свая гісторыя, свае сімвалічныя месцы, звязаныя з генацыдам, які ў дачыненні да беларусаў праводзілі нацысты. Таму вызначылі, што ў кожнай вобласці павінны быць створаны адметныя памятныя знакі. Над праектамі працуе Міністэрства культуры сумесна з Генеральнай пракуратурай. Эскізы памятных знакаў узгадняюцца, у некаторых рэгіёнах над імі ўжо вядзецца актыўная работа. Напрыклад, у Гомельскай вобласці памятны знак ахвярам генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўсталяваны каля населенага пункта Чонкі Гомельскага раёна, у Брэсцкай вобласці ён з'явіцца каля ўрочышча Стасіна Столінскага раёна. На поўначы Беларусі адпаведным чынам будзе мемарыялізавана тэрыторыя каля аднаго з дамоў па вуліцы Крылова ў Віцебску. На Гродзеншчыне для гэтых мэт вызначаны мемарыяльны комплекс у мікрараёне Фолюш у абласным цэнтры, на Магілёўшчыне — мемарыял паблізу аграгарадка Палыкавічы, што ў Магілёўскім раёне. Натуральна, на тэрыторыі Міншчыны найбольш яскравым сімвалам праявядзення палітыкі генацыду ў дачыненні да беларускага народа з'яўляецца мемарыяльны комплекс «Хатынь», у Мінску — тэрыторыя мемарыяльнага комплексу «Трасцянец». Плануецца, што адзіныя памятныя знакі будуць устаноўлены сёлета да 9 снежня, калі будзе адзначацца Міжнародны дзень памяці ахвяр генацыду.

***— Колькі пошукавых экспедыцый запланавана на гэты год?***

— На цяперашні момант ва ўпраўленне паступіла звыш 150 інфармацыйных лістоў па Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі і звыш 120 — у межах расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе. Пошукавыя работы будзем праводзіць ва ўсіх абласцях і раёнах Беларусі. Раскопкі, як заўсёды, пачнуцца ў красавіку і працягнуцца да кастрычніка. Калі будуць прыдатныя ўмовы надвор'я, то палявыя пошукавыя работы завершацца ў лістападзе.

***— Акрамя грамадскіх аб'яднанняў, якія традыцыйна падказваюць вам месцы, дзе могуць знаходзіцца астанкі, адкуль яшчэ паступае інфармацыя?***

— Ад грамадзян, якія шукаюць сваіх сваякоў, загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Яшчэ засталіся жыхары, якія ведаюць, дзе прыблізна на тэрыторыі іх населенага пункта могуць быць няўлічаныя пахаванні. Яны звяртаюцца ў ваенны камісарыят або ў райвыканкам па месцы жыхарства для складання інфармацыйнага ліста. Як правіла, гэтыя людзі і паказваюць пошукавікам канкрэтнае месца. Інфармацыя пацвярджаецца прыкладна ў 80 % выпадках. Калі пошукавыя работы не прыносяць выніку, гэта не азначае, што мясцовыя жыхары нас дэзынфармавалі. Людзі проста не ведаюць, што ў пасляваенны перыяд праводзіліся ўзбуйненні воінскіх пахаванняў — адпаведна раскопкі ва ўказаных імі месцах былі ажыццёўлены раней, астанкі загінулых перапахавалі ў іншыя месцы.

***— Як так атрымліваецца, што сведак тых падзей з кожным годам становіцца ўсё менш, а колькасць палявых пошукавых работ толькі павялічваецца?***

— Рассакрэчаны многія архіўныя матэрыялы. Людзі пачалі актыўна працаваць у архівах, цікавіцца гісторыяй свайго роду. У выніку ў іх з'яўляецца інфармацыя, з якой насельніцтва звяртаецца да нас. Некаторыя людзі цікавяцца гэтым гістарычным перыядам, самастойна вывучаюць баявы шлях пэўных падраздзяленняў — і без нашай дапамогі ім таксама не абысціся. Так, сведак тых падзей з кожным годам становіцца ўсё менш, але архіўная даследчая работа не дае нам сядзець без справы.

***— Ці вялікі шанц падчас раскопак устанавіць імя загінулага?***

— Невялікі. У 1942 годзе медальёны, у якіх захоўвалася інфармацыя аб ваеннаслужачым, адмянілі. На змену ім прыйшлі чырвонаармейскія кніжкі. Потым было павер'е, што калі запоўніць медальён, то яго ўладальнік абавязкова загіне. Адпаведна многія салдаты іх і не запаўнялі. Некаторыя хавалі ў медальёны махорку. Як правіла, з дзесяці медальёнаў, якія знаходзім, толькі тры ўдаецца прачытаць. І гэта нядрэнны вынік. Нават запоўненыя медальёны, якія праляжалі ў зямлі некалькі дзясяткаў гадоў, не заўсёды ўдаецца адnaвіць: адкрываеш медальён, а ўкладыш рассыпаецца. Устанавіць імя загінулага таксама могуць дапамагчы спадарожныя знаходкі. Часам знаходзім з астанкамі кацялок, флягу або лыжку, на якіх пазначана прозвішча вайскоўца. Бывае, што імя адлюстравана на рамяні. Што датычыцца дакументаў, то за столькі часу, якія яны праляжалі ў зямлі, ідэнтыфікаваць іх практычна немагчыма. Аднак бываюць і выключэнні: не так даўно пад Пінскам з балота выцягвалі загінулага лётчыка. Дык ён усе гэтыя гады быццам знаходзіўся ў скафандры: і яго цела, і дакументы захаваліся ў добрым стане.

***— Адна справа — устанавіць імя салдата. А ці лёгка знайсці яго сваякоў?***

— На жаль, гэта адбываецца не так часта. Робім запыты ў ваенкаматы па месцы прызыву: удакладняем, ці пражываюць у гэтай мясцовасці блізкія або далёкія сваякі гэтага чалавека. Калі знаходзім, то сваякі прымаюць рашэнне, дзе вайсковец будзе перапахаваны: або на сваёй радзіме, або на тэрыторыі нашай краіны. Адбываецца гэта з адпаведнымі рытуаламі — беларусы ўмеюць быць удзячнымі тым, хто некалі цаной свайго жыцця абараняў Айчыну.

**Вераніка КАНЮТА.**



# АБЕЛІСКІ ПАРАНЕНАЙ ЗЯМЛІ

# БЕЗ ПРАВА НА ПАМЫЛКУ

## Запушчаны ўнікальны праект, мэта якога — выправіць недакладнасці і блытаніну на абелісках і мемарыялах

**Летась Магілёўскі абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру» атрымаў прэмію «За духоўнае адраджэнне». Гэта высокая ўзнагарода была прысуджана яму за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне моладзі, рэалізацыю разведвальных пошукавых праектаў, увекавечанне памяці абаронцаў Айчыны. Па ініцыятыве кіраўніка клуба Мікалая Барысенкі і яго жонкі Святланы, начальніка штаба «Віккру», быў запушчаны ўнікальны праект, мэта якога — выправіць памылкі і блытаніну на абелісках і мемарыялах у гонар герояў вайны. Мікалай і Святлана ўскладваюць вялікія спадзяванні на гэты праект і дзеляцца з карэспандэнтам «Звязды» падрабязнасцямі такой асаблівай пошукавай работы.**

### ЗНАЙСЦІ ІМЯ

Праект так і называецца — «Навучыся помніць». У савецкі час, калі масава ўзводзіліся мемарыялы ў гонар абаронцаў і вызваліцеляў, на помніках былі допушчаны шматлікія памылкі, якія захаваліся дагэтуль. Нягледзячы на тое, што інфармацыі ў інтэрнэце, каб іх выправіць, хапае, яны застаюцца. А гэта няўвага да памяці герояў.

— Да нас звяртаюцца родныя чырвонаармейцаў з просьбай дапамагчы знайсці іх сваякоў, ведаючы, што продак загінуў на тэрыторыі Магілёўскай вобласці, — уводзіць у курс справы Святлана. — Пачынаем шукаць, а інфармацыя на помніку не супадае з самімі пашпартамі пахаванняў: пераблытаны ініцыялы, прозвішчы. Калі пачынаеш раскручваць клубок, падымаць схемы магіл, кнігі пахавання асабовага складу дывізій і палкоў, бачыш гэтыя разыходжанні. Кагосьці вінаваціць у тым нельга, пахавальныя каманды таксама дапускалі памылкі, запісвалі інфармацыю дзесьці са слоў. І фактаў такіх скажэнняў хапае. У тым ліку і вельмі прыкрых.

На помніку ў Хількавічах у Чавускім раёне, напрыклад, былі нанесены прозвішчы двух байцоў, якія прайшлі вайну і вярнуліся дадому. У свой час яны, напэўна, з нейкай прычыны не з'явіліся на паверку, і іх палічылі загінулымі. Гэтыя ж людзі засталіся жывымі і ўзнагароджваліся ў 1945 годзе, у мірны час. Але ніхто іх прозвішчы з помніка не прыбраў. У той жа час, калі падымаеш баявыя данясенні, выяўляецца вялікая колькасць байцоў, якія насамрэч загінулі, але іх прозвішчаў на абелісках няма. Або ўлічаны двойчы на розных помніках. Былі выпадкі, калі адно і тое ж імя сустракалася на чатырох розных абелісках. Людзі ўспрымаюць такія факты з болем і адчаем.

— Сяргей Лукашэнка, які працаваў кіраўніком музея Верамейскай школы і, на жаль, маладым пайшоў з жыцця з-за цяжкай хваробы, вельмі перажываў, калі не змог дапамагчы адшукаць расіянам роднага чалавека, — успамінае выпадак Святлана. — Калі яны прыязджалі, яго не было ў школе, і яны, не адшукаўшы на мемарыяле, які знаходзіцца каля ўстановы, імя сваяка, прымацавалі на яго медальён з фота загінулага. Сяргей потым пачаў шукаць інфармацыю пра байца і даведаўся, што яго родныя ўсяго некалькі кіламетраў не даехалі да рэальнай магілы.

Па сутнасці, на сайтах райвыканкамаў павінна быць інфармацыя аб загінулых у раздзеле ўвекавечання. Складанасць у тым, што кожны сайт працуе па-свойму і па-рознаму афармляе такую ўкладку. Хтосьці робіць яе асобным банерам, хтосьці адпраўляе ў раздзел «Сацыяльная работа», хтосьці — у «ідэалагічную». Людзі не ведаюць, дзе шукаць. Аналагічная сітуацыя па Расіі. Магілёўскія пошукавікі задумаліся, як выправіць сітуацыю, і вырашылі выкарыстаць для гэтага маладзёжны патэнцыял. Чаму б падлеткам, седзячы ў інтэрнэце, не прыносіць карысць? «Гэта патрэбна не толькі для аднаўлення народнай памяці, але будзе карысна і ім самім, — лічаць Мікалай і Святлана Барысенкі. — Яны ніколі потым не будуць разбураць помнікі і дзецям сваім не дазволяць. Калі ў іх атрымаецца знайсці хоць адно імя, гэта застанецца ў душы назаўсёды».

### ДАРОГА ДА АБЕЛІСКА

Праект разлічаны на чатыры гады — 2022—2025, і ў ім бяруць удзел усе ўстановы адукацыі вобласці, уключаючы ліцэі і каледжы. Этапаў некалькі, але ўсе яны паміж сабой звязаныя. Першы — «Дарога да абеліска» — прайшоў яшчэ летась. Як правіла, за школамі замацаваны канкрэтныя помнікі, за якімі ажыццяўляецца догляд. І першае заданне было такое: вывучыць гісторыю баявых дзеянняў на тэрыторыі канкрэтнага населенага пункта, у тым ліку і гісторыю помніка, і зрабіць справаздачу. Вядома, што адной інфармацыі з інтэрнэту тут недастаткова — трэба было схадзіць у музей, праглядзець патрэбную літаратуру, архіўныя звесткі. Усе цікавыя матэрыялы — фотаздымкі, успаміны, газетныя выразкі — прапанавалася прыкласці да работы. Адзін экзэмпляр гэтых даследаванняў дасылаўся непасрэдна начальніку штаба клуба «Віккру», каб можна было ацаніць зробленую работу.

Наступны этап — «Загінулым вяртаючы імёны» — лагічны працяг пачатай работы. Гэта зноў работа з музеямі, архівамі, раённымі кнігамі «Памяць», матэрыяламі сайтаў «Партызаны Беларусі», «Памяць народа», «Подзвіг народа», АБД «Мемарыял», «Салдат.ру» і гэтак далей. Па спецыяльнай методыцы, якая напісана аўтарамі праекта, шукаюцца канкрэтныя імёны і параўноўваюцца з тымі, што на помніках і на сайтах. На гэтым этапе дзецям аказваюць садзейнічанне аддзелы ідэалагічнай работы райвыканкамаў, дзеляцца спісамі загінулых чырвонаармейцаў. Падлеткі прапрацоўваюць іх праз усе дакументы. Складаюць картку, дзе чырвоным колерам пазначаюць знойдзеныя недакладнасці са спасылкамі на крыніцу інфармацыі. Адзін экзэмпляр гэтых даследаванняў са зваротам аб унясенні правак на воінскі абеліск дасылаецца ў аддзел ідэалагічнай работы, а другі — зноў-ткі «Віккру» — для падвядзення вынікаў і ацэнкі, наколькі правільна спрацавалі. І, як вынік, падчас традыцыйнай акцыі «Беларусь памятае» школьнікі, акрамя партрэтаў сваіх родных, якія не вярнуліся з вайны, праносяць і партрэты тых, чые імёны яны ўстанавілі падчас пошукаў. Калі няма фота, то дастаткова таблічкі з імем.

— Гэта вельмі важна, — лічыць Святлана. — Адбыліся цяжкія абарончыя і вызваленчыя баі, — чырвонаармейцы загінулі, і ніхто не ведае, дзе іх шукаць. Атрымліваецца, што мы іх ніяк не згадваем. Гэта няправільна. Хочацца, каб дзеці тое зразумелі, прасякнуліся гэтым. Ніякія падручнікі, статыстыка не паўздзейнічаюць на іх так, як асабістая работа. Яны самі дакрануцца да арыгіналаў, убачаць, наколькі маладымі былі тыя, хто загінуў падчас баёў. Якія жахлівыя і крывавыя тыя бітвы! Гэта вельмі моцны выхаваўчы момант.

Асобная размова пра генацыд, знішчэнне мірнага насельніцтва. Мы ўсе добра ведаем тыя помнікі, ускладаем да іх кветкі, але мала дзе ёсць імёны загінулых жыхароў. Іх імёны таксама можна знайсці. Не ўсе, але нават калі адно або два будуць вернуты з небыцця, гэта ўжо перамога.

— Існуюць розныя сайты, дзе такая інфармацыя ёсць, — кажа суразмоўніца. — Напрыклад, вельмі добры памочнік у гэтым — ізраільскі сайт «Яд ва-Шэм», раённыя кнігі «Памяць», матэрыялы Нацыянальнага архіва. Расіяне перадалі ў наш Нацыянальны архіў спісы расстраляных, спаленых, сагнаных на прымусовыя работы ў Германію. Задачы дзяцей — скласці поўныя, наколькі магчыма, спісы чалавечых страт. І падрыхтаваць тыя спісы для інфармацыйных стэндаў. Спадзяюся, што дэпутаты дапамогуць дзецям (мы да іх звярталіся) знайсці сродкі на стэнды. Помнікі мы таксама зробім, але з часам. Каб інфармацыя не страцілася, яе трэба захаваць хоць бы ў выглядзе стэндаў.

На пэўным этапе юныя пошукавікі будуць устанаўліваць інфармацыю пра сваіх землякоў, якія загінулі на франтах або ў партызанах. Потым — вывучаць імёны байцоў, што загінулі пры абароне і вызваленні раёнаў. Пасля — паспрабуюць устанавіць невядомыя імёны. Для гэтага давядзецца прайсціся па мясцовасці, апытаць жыхароў, пазначыць няўлічаныя пахаванні, калі такія знойдуцца.

— Самастойна школьнікі такую работу не выканаюць, — кажа Святлана. — Павінны падключыцца педагогі, раённыя ідэолагі. За чатыры гады мы парадак адразу не навядзём, дзеці зробяць, колькі змогуць. Але акцыя будзе працягвацца, магчыма, у іншым выглядзе, і вынік абавязкова будзе. Першыя вынікі ёсць, і яны абнадзейваюць. У той жа акцыі «Дарога да абеліска» пераможцам стаў магілёўскі ліцэй № 9 імя А. Старавойтава. Дзеці правялі грунтоўнае добраўпарадкаванне сельскага мемарыяла ў вёсцы Гараны Магілёўскага раёна — знялі плітку, зрабілі якасную падсыпку, дарожку. Таксама зрабілі фундаментальную справаздачу — з фотаздымкамі да рэканструкцыі і пасля, апісаннем гісторыі, расповедамі відавочцаў. Не проста кветкі кінулі і сфатаграфаваліся каля помніка. На жаль, сёння фармалізм у адносінах да памяці прысутнічае. Так быць не павінна. Наш праект рэалізоўваем сумесна з Магілёўскім абласным цэнтрам творчасці. На першым этапе ў ім узяло ўдзел каля 550 чалавек. Сёння стаіць пытанне перавыдання раённых кніг «Памяць». І гэтыя дзіцячыя работы будуць там улічаны.



Пераможцы акцыі «Дарога да абеліска» — навучэнцы магілёўскага ліцэя № 9 імя А. Старавойтава на мемарыяле ў вёсцы Гараны Магілёўскага раёна.

### ГЭТА ТРЭБА НЕ МЁРТВЫМ...

Нягледзячы на тое, што Вялікая Айчынная вайна закончылася ледзь не восем дзесяцігоддзяў таму, боль страты ў сем'ях, у якіх загінулі сын, бацька, маці, дачка, не сціхае. На жаль, сёння недастаткова беражліва ставяцца да той памяці. Некаторыя лічаць, што з той вайной ужо ўсё зразумела і не трэба варушыць мінулае.

— Гэта цалкам памылковае меркаванне, — рэзюмуе Мікалай Барысенка. — Мы павінны памятаць тую вайну, каб грамадства правільна тлумачыла для сябе праблемы ў сучасным свеце. Яны не з'яўляюцца на голым месцы. У Магілёўскай вобласці сёння 1734 брацкія і адзіночныя магілы, у якіх пахаваны 334 тысячы нашых воінаў і ахвяр вайны. З іх нам вядомыя імёны толькі 62 тысяч. Трэба пастарацца, каб скараціць спісы невядомых, загінулых у 1941—1944 гадах на тэрыторыі Магілёўшчыны. Пошукавы клуб «Віккру» за 29 гадоў свайго існавання па архівах, расійскіх і беларускіх базах даных устанавіў імёны 27 тысяч чырвонаармейцаў. Работу пагаршае тое, што практычна сышлі ветэраны вайны, старажылы, відавочцы крывавых падзей. Гэта падштурхоўвае нас шукаць новыя спосабы і метады пошуку імёнаў. І наш праект — адзін з найбольш дзейсных.

Летась пры ўдзеле «віккруўцаў», сумесна з 52-м пошукавым батальёнам і абласной пракуратурай былі выяўлены новыя пахаванні воінаў Чырвонай Арміі і мірных жыхароў у Асіповіцкім, Слаўгарадскім, Клічаўскім, Шклоўскім, Магілёўскім раёнах. Пошукавікі сведчаць пра новыя, самаробна абазначаныя месцы пахаванняў, якія пакінулі так званыя чорныя капальнікі або мясцовыя жыхары. За апошні час пяць такіх вось пахаванняў у Магілёўскім, Чавускім і Быхаўскім раёнах былі перанесены на найбліжэйшыя ўлічаныя воінскія брацкія магілы.

Яшчэ адна праблема ў тым, што шмат абязлічаных воінскіх пахаванняў, а таксама магіл расстраляных мірных жыхароў знаходзіцца на грамадзянскіх могілках. Па інфармацыі пошукавікаў, пры садзейнічанні мясцовых уладаў у Магілёўскім, Шклоўскім і Чавускім раёнах праведзена добраўпарадкаванне з устаноўкай памятных знакаў на сямі такіх пахаваннях.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру».**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому городскому филиалу Гродненского областного потребительского общества

**Аукцион состоится 14.02.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-163518 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 158 кв. м, Гродненский р-н, Индурский с/с, д. Сухая Долина, 14А. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422083611601000116, площадью 0,0303 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Индурский с/с, д. Сухая Долина, 14А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов |
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 400/С-27331 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 113,5 кв. м, Гродненский р-н, Квасовский с/с, д. Горны, 55Б. Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 422084002601000021, площадью 0,0791 га (назначение – эксплуатация и обслуживание магазина), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Квасовский с/с, д. Горны, 55Б |
| **Начальная цена продажи** | **ЛОТ № 1** – 14 716,80 руб. (четырнадцать тысяч семьсот шестнадцать рублей восемьдесят копеек) с учетом НДС. **ЛОТ № 2** – 17 433,60 руб. (семнадцать тысяч четыреста тридцать три рубля шестьдесят копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | **ЛОТ № 1** – 1 471 руб. (одна тысяча четыреста семьдесят один рубль). **ЛОТ № 2** – 1 743 руб. (одна тысяча семьсот сорок три рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 10 февраля 2023 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 26.05.2022 г. | |
| Условия проведения аукциона:<br>- оплату приобретаемого объекта производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь;<br>- расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возлагаются на Покупателя;<br>- право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>- документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.<br>Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 1. Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-13915 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – А 2/к. Административное здание, общая площадь – 614,9); 2. Видеонаблюдение «Административное здание по ул. Широкая, 4 с гаражами»; 3. Автомот. пожарная сигнализация в здании по ул. Широкая; 4. Ворота металл. с забором, ул. Широкая; 5. Шкаф д/документов; 6. Стол письм., 4 шт.; 7. Шкаф под мойку 800*505*820; 8. Шкаф под мойку 900*550*850; 9. Зеркало настен. РБ, 2 шт.; 10. Набор мебели «Премьера»; 11. Стул, 6 шт.; 12. Шкаф-стеллаж; 13. Шкаф д/одежды СВ-41; 14. Стеллажи, 2 шт.; 15. Стол угловой 1400*1000*750, 6 шт.; 16. Стул офисный поворотный SAMBA; 17. Стол пристав./орех; 18. Тумб. треш. на кол./орех/РБ; 19. Стул на раме ISO BLACK 19 С-11; 20. Стул ИЗО, блэк; 21. Шкаф комб.Н-202, груша; 22. Диспенсер д/полотен. бумажн., 2 шт.; 23. Шкаф для бумаг 600*333*1930; 24. Шкаф-стеллаж с фасадом 400*400*2100; 25. Шкаф в сборе; 26. Стол письмен., 4 шт.; 27. Стол письменный; 28. Стол В-32 орех; 29. Полка угловая/, 2 шт.; 30. Подставка п/процессор; 31. Подставка под процессор К-505 орех; 32. Подставка п/монитор, 2 шт.; 33. Жалюзи вертик., 58,9 м²; 34. Диван /Мирко/; 35. Стол, 3 шт.; 36. Стол(пр) пис20/1600, 2 шт.; 37. Стол-приставка; 38. Стол; 39. Стол/лев./письмен.; 40. Стол компьютерн./каб.14а/; 41. Тумба приставная, 4 шт.; 42. Стол конт. с шуфлядами 1400*700; 43. Стол 1600*1100*760 Ш.; 44. Тумба 422*500*530, 8 шт.; 45. Тумба-доставка 31/400, 3 шт.; 46. Тумба мобильная 400*500*650 Ш., 2 шт. 47. Тумбочка с замком; 48. Стул ИЗО, блэк, 3 шт.; 49. Шкаф-перегородка с откр. верх. полками Сазанчук; 50. Шкаф платяной 800*400*1840; 51. Шкаф для одежды РМ-4 804х607х1800; 52. Шкаф-купе стеллаж 5200/2700/515; 53. Шкаф-купе с тумбочкой 26-1; 54. Полка подвесная /№ 10, 4 шт.; 55. Холодильник с морозильником МХ 2822-80; 56. Вентилятор напольн.; 57. Подставка под процессор К-505, орех, 6 шт.; 58. Шкаф РМ-4/К 804х452х1800; 59. Стол В-320, орех; 60. Стол 1477*602*710; 61. Стол С-36, груша; 62. Шкаф; 63. Стул, 6 шт.; 64. Беседка металлическа для курения; 65. Охранная сигнализация/для шлагбаум. пульт и систем. контроля/; 66. Шлагбаум ELL 5; 67. Установка для чистки воды «Цептер» | 956 799,96 | 95 680,00 | 47 840,00 |
| В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые торги | | | | |
| Местонахождение: Минская обл., г. Минск, ул. Широкая, 4/2 | | | | |
| **Ограничения (обременения):** лот № 1 находится в залоге. В отношении лота № 1 имеется обременение в виде договоров аренды. Дополнительная информация по тел. **+375293396845 (Артур)** | | | | |
| Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 500000000008003120, площадью 0,1275 га, для эксплуатации и обслуживания административного здания. Право аренды. Ограничения (обременения): земли, находящиеся в санитарно-защитных полосах водоводов, код – 4, пл. 0,0606 га | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **23 февраля 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 23 января 2023 года до 16.00 21 февраля 2023 года** | | | |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ», проводимых 23.02.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560. Дополнительная информация по предмету торгов по тел.: +375293042560, +375293082897.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375173515452, +375293396845, e-mail: pc-bel@tut.by (220090, г. Минск, улица Широкая д. 4, УНП 600013209)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому городскому филиалу Гродненского областного потребительского общества

**Аукцион состоится 14.02.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **ЛОТ 1:** капитальное строение, инв. № 400/С-164255 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 98,1 кв. м, Гродненская обл., Гродненский р-н, Квасовский с/с, д. Нетечи, 42.<br>ЛОТ № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422084009101000108, площадью 0,0636 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Квасовский с/с, д. Нетечи, 42. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель в виде: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 0,0098 га.<br>**ЛОТ 2:** капитальное строение, инв. № 400/С-164257 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 111,1 кв. м, Гродненская обл., Гродненский р-н, Коптёвский с/с, д. Жиличи, 1А.<br>ЛОТ № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 422084503601000054, площадью 0,0393 га, (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Коптёвский с/с, д. Жиличи, 1А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель в виде: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), код – 2,4, площадь 0,0393 га.<br>**ЛОТ 3:** капитальное строение, инв. № 400/С-163966 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 117,7 кв. м, Гродненская обл., Гродненский р-н, Сопоцкинский с/с, д. Селивановцы, 25А; котел отопительный, инв. номер ГР0000262.<br>ЛОТ № 3 расположен на земельном участке, кадастровый № 422086312801000152, площадью 0,0975 га, (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Сопоцкинский с/с, д. Селивановцы, 25А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель в виде: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 0,0035 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), код – 2,4, площадь 0,0975 га.<br>**ЛОТ 4:** капитальное строение, инв. № 400/С-107901 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 80,5 кв. м, Гродненская обл., Гродненский р-н, Индурский с/с, д. Яскевичи, 1Е; капитальное строение, инв № 400/С-107902 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 50,4 кв. м, Гродненская обл., Гродненский р-н, Индурский с/с, д. Яскевичи, 1Е/1; охранная сигнализация, инв. номер ГР0000307; пожарная сигнализация, инв. номер ГР90000308; котел, инв. номер ГР0000068.<br>ЛОТ № 4: расположен на земельном участке, кадастровый № 422083612101000008, площадью 0,1637 га, (назначение – для эксплуатации и обслуживания здания магазина и склада), расположенном по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Индурский с/с, д. Яскевичи, 1Е. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадь – 0,1637 га |
| **Начальная цена продажи** | **ЛОТ № 1**– 21 156,00 руб. (двадцать одна тысяча сто пятьдесят шесть рублей) с учетом НДС.<br>**ЛОТ № 2** – 16 356,00 руб. (шестнадцать тысяч триста пятьдесят шесть рублей) с учетом НДС.<br>**ЛОТ № 3** – 35 279,51 руб. (тридцать пять тысяч двести семьдесят девять рублей пятьдесят одна копейка) с учетом НДС.<br>**ЛОТ № 4** – 31 861,71 руб. (тридцать одна тысяча восемьсот шестьдесят один рубль семьдесят одна копейка) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | **ЛОТ № 1 –** 2 115,00 руб. (две тысячи сто пятнадцать)<br>**ЛОТ № 2 –** 1 635,00 руб. (одна тысяча шестьсот тридцать пять)<br>**ЛОТ № 3 –** 3 527,00 руб. (три тысячи пятьсот двадцать семь)<br>**ЛОТ № 4 –** 3 186,00 руб. (три тысячи сто восемьдесят шесть) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 10 февраля 2023 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 22.11.2022 г. | |
| Условия проведения аукциона: оплату приобретаемого объекта производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь; расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возлагаются на Покупателя; право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

# «12 АПОСТАЛАЎ» У ІНТЭР'ЕРЫ

## Супрацоўнік міліцыі з Гродна і яго знакамітыя караблі

**Калекцыя Паўла НАВАКОЛЬСКАГА складае больш за 20 стэндавых мадэляў. Калі ўлічваць, што на выраб адной можа спатрэбіцца некалькі гадоў — гэта нямала. Праўда, большасць засталася ў Гродзенскім абласным цэнтры тэхнічнай творчасці, адкуль пачалося яго захапленне яшчэ ў 13-гадовым узросце. Пасля перапынку Павел вярнуўся да суднамадэліравання і стварыў некалькі вельмі складаных і прыгожых копій караблёў з цікавай баявой гісторыяй.**



Захапленне караблямі пачалося з прыгодніцкіх кніг аб далёкіх марскіх вандроўках. У падлетка з'явілася жаданне далучыцца да гэтых незвычайных падарожжаў. Так ён трапіў у гурток па суднамадэліраванні ў Гродзенскім абласным цэнтры тэхнічнай творчасці. Гурток паспяхова працуе і цяпер. Павел, як і многія іншыя гурткоўцы, марыў аб паступленні ў ваенна-марское вучылішча ў Калінінградзе.

Ён наведваў «Мадэліраванне» да 10 класа. Прымаў удзел у многіх рэспубліканскіх спаборніцтвах. Выканаў нарматыў кандыдата ў майстры спорту па суднамадэліраванні. А калі прыйшоў час вызначацца з будучай прафесіяй, вырашыў пайсці па слядах бацькі, супрацоўніка міліцыі, які зачапіўся пайшоў з жыцця. Хлопец паступіў у Беларускі інстытут правазнаўства. На некаторы час заняткі суднамадэльнай творчасцю прыпыніліся.

Зараз Павел Наваколькі служыць у Кастрычніцкім РАУС Гродна старшым участковым інспектарам па справах непаўналетніх. Кажа, што клопатаў хапае і па рабоце, і ў сям'і — у яго падрастае двое сыноў, 6 і 9 гадоў. Вольнага часу застаецца зусім мала, але Павел знаходзіць гадзіну-другую ў выхадныя дні, каб заняцца сваім хобі. Да таго ж менавіта дзякуючы працы з'явіліся сродкі, каб набываць матэрыялы для мадэляў, а каштуе гэта нятанна. Напрыклад, сабекошт адной з мадэляў складае каля 900 долараў.

Карабель адразу звяртае на сябе ўвагу, хоць і стаіць у куту пакоя. Гэта флагман расійскага імператарскага флоту пачатку XIX стагоддзя «12 апосталаў» — адзін з самых магутных ваенных караблёў свайго часу. Як ён калісьці выглядаў, можна ўбачыць на карціне, на фоне якой яскраз і стаіць макет. Праўда, мастак намаляваў усю флатылію з раздзьмутымі белымі парусамі. На мадэлі яны таксама ёсць, але скручаны, нібы карабель стаіць на рэйдзе. Чаму так?

— Парусы сабраны, іх немагчыма расправіць, таму што яны займаюць вельмі шмат месца і хаваюць дэталёўку карабля, адцягваюць на сябе шмат увагі, — тлумачыць Павел. — Парусы трэба крухмаліць, каб стварыць эфект напоўненасці ветрам. Але тады карабель будзе падобны на белы шар. Я раблю па прынцыпе, каб было ўсё відаць, таму і наступная мадэль будзе таксама са складзенымі парусамі. Такі ў мяне падыход, хтосьці зробіць па-іншаму, я выбраў менавіта так.

Каб максімальна наблізіць макет да арыгінала, трэба правесці вялікую падрыхтоўчую работу. Напрыклад, на стварэнне «12 апосталаў» майму суразмоўцу спатрэбілася тры гады. Амаль палову часу заняў пошук чарцяжоў. Складанасць яшчэ і ў тым, што арыгінала не засталося. Падобны карабель «Віктары» захаваўся ў флоце Вялікабрытаніі. Праўда, толькі ў якасці музея. Таму і чарцяжы ў асноўным на англамоўных інтэрнэт-платформах.

Аналагічная сітуацыя склалася падчас мадэліравання нямецкага лінкора «Бісмарк». Работа над ім заняла два гады. Паколькі чарцяжоў не ўдалося знайсці, мадэль стваралася па здымках і кадрах кінахронікі. Дарэчы, лёс лінкора быў нядоўгі, ён патоплены падчас Другой сусветнай вайны, літаральна праз некалькі гадоў пасля пабудовы. А вось новы праект інспектара — карабель «Канстытуцыя» — да гэтага часу на плаву. І гэта адзіны ва ўсім свеце ваенны парусны карабель, які можа плаваць. І хоць ён прышвартаваны ў Бостане ў якасці музея, з 1780 года і да нашага часу ўваходзіць у склад ваенна-марскіх сіл ЗША. Паколькі ёсць яго рэальныя здымкі, рабіць гэту мадэль не так складана.

Увогуле, праца даволі карпатлівая. На драўляны корпус судна, памерам 1,5-2 метры, мацуецца мноства дэталяў з металу і пластыку. Частка набываецца праз інтэрнэт, але большасць робіцца сваімі сіламі. Напрыклад, выразаюцца з пэўных парод дрэў элементы корпуса, мачты, рэі, карабельныя пабудовы, іншыя дэталі. У якасці інструментаў пад рукой павінны быць скальпель, пінцэт, мікрадрылі, такія ж свердлы, мінітакарны станок, аэрограф для афарбоўкі.

— Вядома, можна купіць гатовы набор і скласці карабель згодна са схемай. Але гэта атрымаецца звычайная цацка. Такі набор прыдатны для тых, хто пачынае мадэліраванне, толькі вучыцца гэтаму. Мне гэта не падыходзіць, бо мадэль павінна быць максімальна набліжана да рэальнасці. Гэта не цацка, а зменшаная копія арыгінала. У гэтым сутнасць стэндавага мадэліравання. Таму свае караблі я ствараю з нуля, — кажа Павел.

Ён лічыць, што творчасць — добрая разгрузка для любога чалавека. Падчас работы ёсць магчымасць сабрацца з думкамі, аднавіць свой энергетычны патэнцыял. Наогул, змена роду дзейнасці карысная. Да таго ж бачны вынік працы. А караблі — гэта заўсёды прыгожа.

Дома ў Паўла знаходзяцца мадэлі, створаныя за перыяд яго работы ў міліцыі, ды адно з першых суднаў, якое зроблена больш за 20 гадоў таму, яшчэ ў 8 класе. Праўда, карабель пацярпеў ад увагі ката, які заскочыў на тэлевізар і зваліў яго на падлогу. Такія недарэчнасці каштуюць канструктару нерваў. З таго часу кот мадэлі не чапае, а пашкоджаны карабель Павел збіраецца адрамантаваць.

Караблі — не адзіныя творы гродзенскага інспектара. Ёсць у яго арсенале і знакаміты ваенны танк «Тыгр», а яшчэ — зменшаная копія аўтамабіля ЗІС-110. 70-сантыметровы экспанат поўнасцю з металу, таму яго вага дасягае 15 кілаграмаў. Там усё адчыняецца: дзверы, капот, багажнік... Салон, рухавік дэталізаваныя на сто працэнтаў. Менавіта на такім лімузіне ездзіў Сталін, пакуль не перасеў на больш браніраваны аўтамабіль. Ёсць ахвотныя купіць гэту мадэль за 1,5 тысячы рублёў, але Павел не мае мэты штосьці прадаваць. Сапраўды, калі ўлічваць, што на выраб толькі аднаго карабля траціцца 2-3 гады жыцця, якімі грашыма гэта можна адмераць?

— Хобі прыносіць мне задавальненне. Падабаецца і сам працэс стварэння мадэлі, і вынік. Лічу вельмі важным месца нейкія захапленні. Калі ў маіх сыноў з'явіцца жаданне чымсьці займацца альбо яны захочуць праявіць сябе ў якой-небудзь справе, з радасцю іх падтрымаю. І гэта неабавязкова павінна быць мадэліраванне. Бо ўсе мы розныя і ў кожнага свае здольнасці. Важна развіваць талент, гэта дапамагае спраўляцца і з прафесійнымі абавязкамі, — рэзюмуе Павел.

З ім згодная і жонка Анастасія. Яна працуе ў абласным упраўленні МНС, а ў вольны час піша карціны. Яе вельмі натхняе творчасць Ван Гога, Далі, Пікасо і імпрэсіяністаў. У кватэры каля дзясятка копій знакамітых мастакоў.

Вось так маладая сям'я служачых стварае вакол сябе прыгажосць у простай кватэры звычайнай гарадской «панэлькі». Кожны, хто прыходзіць да іх, у першую чаргу звяртае ўвагу на караблі Паўла і карціны Анастасіі. Яны радуюць вока і прыводзяць душу ў захапленне больш, чым раскошныя і вычварныя інтэр'еры.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

# БАКСЁР І ТУФЛІКІ

**У маі мінулага года ў Віцебску адкрылася майстэрня высокага ўзроўню па рэстаўрацыі абутку, кіруе якой беларускі баксёр з афрыканскімі каранямі Малік ДЗІЯРА. Ён аддаў боксу 34 гады, дасягнуў высокіх спартыўных вяршынь, а пасля адкрыў у сабе новыя, творчыя здольнасці.**



Асвойваць баявое мастацтва Малік пачаў у Оршы, тады юнаку было 14 гадоў. Ужо праз два гады стаў займацца ў заслужанага трэнера СССР Валерыя Кандрацёнкі, які выхаваў алімпійскага чэмпіёна Вячаслава Яноўскага. Вучыўся ў мясцовай 29-й школе і паступова, крок за крокам, а правільней было б сказаць — бой за боем, будаваў шлях у прафесійны спорт. У 1998 годзе падпісаў кантракт з чэмпіёнскім клубам Германіі — гэта для Дзіяры стала выхадам на міжнародную арэну.

Беларускаму баксёру давялося пажыць не толькі ў Сінявокай, але і ў Расіі, Германіі, шмат паездзіць па свеце. У асабістым заліку Маліка шмат высокіх дасягненняў: ён быў членам зборнай Беларусі па боксе, удзельнікам чэмпіянатаў Еўропы, пераможцам і прызёрам шматлікіх міжнародных турніраў. За сваю прафесійную кар'еру правёў больш за 350 афіцыйных баёў сярод аматараў і 33 баі сярод прафесіяналаў, у 29 з якіх атрымаў перамогу. На захадзе спартыўнай кар'еры бой Маліка Дзіяры з выхаванцам карагандзінскай школы бокса Генадзем Галоўкіным стаў для беларуса не толькі апошнім, але і самым запамінальным. Яго сапернік праз бой уже змагаўся за тытул чэмпіёна свету. Сваёй нестандартнай траекторыяй ударaў Гена здзівіў заслужанага баксёра. Самым высокім сваім дасягненнем баец лічыць тытул інтэркантынентальнага чэмпіёна па боксе сярод прафесіяналаў па версіі IBF. Старонкі YouTube і дагэтуль берагуць яркія кадры з тых запамінальных баёў.

Пасля Малік вырашыў вярнуцца ў Віцебск, са спортам канчаткова не завязаў — апошнія 14 гадоў трэнераваў узыходзячых зорак баксёрскага Алімпа. Калі са сваёй спадарожніцай жыцця Яўгеніяй вырашалі, чым займацца далей, хацелі адкрыць сваю залу адзінаборстваў, а пасля творчы пачатак узяў верх. Звярнулі ўвагу на сферу паслуг, а канкрэтна — на майстэрню па рэстаўрацыі абутку. Прасачылі, як працуюць у гэтай сферы найлепшыя прадпрымальніцкія аб'екты ў краіне, спыніліся на адной са сталічных кампаній і ў маі адкрылі ўнікальную для горада на Дзвіне рэстаўрацыйную майстэрню. Разам ездзілі глядзець мінскую вытворчасць, навучаліся. Справа была абсалютна новай для Маліка і Яўгеніі, а адзін цікавы выпадак і натхніў на тое, каб сабраць сваю каманду прафесіяналаў: трэба было адрэстаўрыраваць дарагія фірмовыя туфлі, аднак майстра, які б узяўся за карпатлівую работу, не знайшлі. З гэтага і пачаўся летапіс новай майстэрні.

Ад ідэі да яе рэалізацыі прайшло няшмат часу, месяц за месяцам напрацоўвалі базу кліентаў, пашыралі шэраг паслуг. Як расказвае мужчына, яго майстры працуюць з абуткам рознага цэнавага сегмента: ад айчынных вытворцаў да прэміяльных брэндаў. Часта кліенты прыносяць унікальныя пары, малюнак ці ўзор на якіх аднавіць няпроста, тады ў ход ідзе ручны роспіс — а гэта ўжо цэлае мастацтва, што і робіць майстэрню адметнай. Прыносяць сюды не толькі абутак знакамітых брэндаў, але і проста любімыя красоўкі, ад якіх цяжка адмовіцца па прычыне зносу.



Каб з галавой паглыбіцца ў новую справу, баксёр часова пакінуў індывідуальныя трэніроўкі, аднак плануе прымаць удзел у знакавых спартыўных мерапрыемствах, каб папулярызаваць моцную віцебскую школу бокса.

А на пытанне, як адзін чалавек можа быць такім разнапланавым і мэтанакіраваным, Малік Дзіяра адказаў так: «Бокс навучыў мяне аднаму карыснаму правілу: не варта нічога ні ад кога чакаць. Будзьце настойлівым, і вы дасягняце таго, да чаго імкнецеся».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з архіва героя.**

Выпуск № 2 (609)

# ЗОРНАЯ ГАМА: ВАСІЛЬКІ, КАРАНІ, ЭМОЦЫЯ

## Анастасія Масквіна — прымадонна, якая разбурае стэрэатыпы

**Як пісаў Максім Багдановіч, «Добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком». Але прыродны дар — толькі частка вялікага таленту. Майстры, якіх мы бачым на вялікіх сцэнах, усё жыццё цяжка працуюць, каб глядач захапляўся той лёгкасцю, натхнёнасцю, з якой яны спяваюць ці танцуюць. Хто найлепш пра гэта ведае, чым народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, загадчык опернай трупы Вялікага тэатра Беларусі, чароўнае сапрана Анастасія МАСКВІНА? Мы сустрэліся ў закуліссі пасля традыцыйных навагодніх канцэртаў. Хтосьці побач распяваўся, рэпеціравалі музыкі... Уласна кажучы, і нашу размову можна ўявіць у выглядзе музычнага твора — ну, хоць бы звычайнай гамы...**

### *DO.* Місія васілька

*Першая нота, першы склад слова «Dominus», скіроўвае нас да духоўнага... Дарэчы ўспомніць нядаўні Мінскі міжнародны оперны Калядны форум, які паспяхова адбыўся на радасць гледачам і насуперак усім неспрыяльным абставінам.*

— У нас штогод павінен адбывацца Калядны форум, і мы яго праводзім. Як кажа наш Прэзідэнт, нягледзячы на тое, што вакол адбываецца, кожны павінен рабіць сваю працу, — усміхаецца Анастасія Масквіна. — У самыя складаныя часы гучала песня, якая дапамагала людзям. Недарэмна ж падчас Вялікай Айчыннай вайны фарміраваліся ў тым ліку з артыстаў нашага тэатра франтавыя агітбрыгады, і знакамітая Ларыса Александроўская ездзіла і спявала... У цудоўным творы Максіма Багдановіча «Апокрыф» Хрыстос чуе, як жнеі пяюць песню пра васілёк, і параўноўвае дзеяча культуры, музыканта з васільком, — жытнёвае поле не будзе поўным без гэтых кветак, якія камусьці здаюцца пустазеллем, але радуюць душу селяніна сваёй красою. Оперны форум адбыўся паспяхова. З прэм'ер апошняга сезона на прадстаўлені «Любоўны напой» Даніцэці ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра нашага тэатра Ганны Маторнай. Са знакавых спектакляў рэпертуару — «Турандот» Міхаіла Панджавідзэ, які мы аднавілі ў гэтым годзе. Два спектаклі форуму цалкам былі «гасцявыя» — «Яўгеній Анегін» маскоўскай Гелікон-оперы і «Шаўковая лесвіца» «Астана Опера». І якраз адразу пасля форуму ў нас адбылася прэм'ера оперы Баневіча «Кай і Герда». Спектакль гэты ідзе «двайніком» — раніца-вечар і збірае поўныя залы. Ён для сямейнага прагляду: прыгожая музыка, яркая карцінка, добрая казка, якая зараз вельмі нам патрэбная, — пра дабро, пра мір. Кранае так, што клубок у горле, слёзы...

### *RE.* Карані, Караткевіч

*Назва ноты паходзіць ад «rerum», матэрыя... Тое, без чаго нельга стварыць варты твор. Хіба гэты абавязковы складнік — не нацыянальная культура?*

***— Падчас Каляднага форуму на прэс-канферэнцыі з прадстаўнікамі «Астана Опера» ўсіх уразіла, што госці налічылі пяць нацыянальных опер у сваім рэпертуары — і па літаратурных творах, і пра гістарычных персанажаў, і нават фэнтэзі паводле казахскага нацыянальнага эпасу. Пра неабходнасць з'яўлення новых опер, якія прадстаўлялі б беларускую нацыянальную гісторыю, культуру, гаворыцца шмат... Але ці будзе тут зрух? Ведаю, што ў вашым рэпертуары ёсць дзве партыі з опер па творах Уладзіміра Караткевіча — Ірына з «Сівой легенды» і Надзея Яноўская з «Дзікага палявання караля Стаха»...***

— Я вельмі люблю выконваць згаданыя вамі партыі, хоць у апошняй пастаноўцы «Дзікага палявання караля Стаха» не ўдзельнічаю. Над партыяй Ірыны мы працавалі разам з аўтарам, Дзмітрыем Смольскім. Опера «Сівая легенда» знакавая для мяне, таму што спектакль у пастаноўцы Міхаіла Панджавідзэ атрымаў Дзяржаўную прэмію. Новая пастаноўка гэтай оперы Ганны Маторнай таксама знакавая, ідзе з аншлагамі, нядаўна мы паказвалі яе ў Вялікім тэатры Расіі, знаёмілі такім чынам расіян з нацыянальнай беларускай культурай. Гэта вельмі важна, таму што не так часта гучыць беларуская музыка ў іншых краінах. Думаю, на такія оперы трэба прыводзіць школьнікаў, студэнтаў. А пашырэнне нацыянальнага рэпертуару залежыць не ад нас, а ад кампазітараў. Калі б былі новыя вартыя оперы, яны б у нас ужо ішлі.



### *MI.* Ад гітары да арыі

*Mi — ад miraculum, цуд... Хіба не цуд — чароўны голас, які даецца звыш?*

***— Успамінаю мемуары адной вядомай спявачкі, як яна маленькая сядзела пад сталом і для мамы і яе гасцей ад прыроды пастаўленым голасам спявала арыі...***

— Разумееце, гэта ж мемуары... Гульня з чытачом. У пяць гадоў пастаўленым голасам ніхто не спявае пад сталом. Здаецца, што раз зорка оперы — дык у дзяцінстве павінна спяваць Кармэн... Гэта стэрэатып. Я разбураю ўсе стэрэатыпы. Я ў дзяцінстве нават у оперу не хадзіла. Хаця музыкай займалася з дзяцінства, па класе скрыпкі сем гадоў у 2-й музычнай школе. Але не кожная дзяўчынка хоча стаць опернай спявачкай. Памятаю, скончыла музычную школу — думаю, ну ўсё, хопіць... У тэатр пайду, актрысай буду... У мяне першая адукацыя — універсітэт культуры, рэжысура тэатральнага калектыву. Хаця на ўсіх канцэртах спявала пад гітару. Літаральна ўчора ў бацькоў знайшла часопіс «Тэатральная Беларусь» за 1994-ы, і я там на вокладцы, з гітарай. Першую арыю я праспявала ў кансерваторыі. Не думала, што опера — мой лёс, проста вучылася акадэмічнаму вакалу. Многія ж спевакі — Градскі, Магамаеў, Кабзон — атрымалі такую адукацыю, з якой пайшлі на эстраду. Толькі калі пачала займацца ў Акадэміі музыкі, пабачыла, якое гэта незвычайнае асяроддзе, гэтыя твары, вочы, яскравыя таленты... Я зразумела, што хачу быць часткай гэтага.

### *FA.* Сюрпрыз для сям'і

*Нота ўтварылася ад «familias planetarium», «сям'я планет»... У кожнай зоркі ёсць сям'я. Кожнага музыку вадзілі ў музычную школу, змушалі да бясконцых практыкаванняў... Анастасіі Масквіной пашанцавала — бацькі заўсёды падтрымлівалі і разумелі.*

— Мне ўвогуле дазвалялі рабіць усё, што я хацела, ніхто не змушаў да выбару прафесіі. Калі ў мяне выявілі абсалютны музычны слых, адвялі ў музычную школу. Я са звычайнай сям'і, мае бацькі — інжынеры, бабулі і дзядулі не хадзілі ў оперу. Не было ў нашым родзе музыкаў ці артыстаў. Дзед скончыў Баўманскае вучылішча, і ў 1944-м, як толькі вызвалілі Мінск, яго прыслалі сюды ствараць аўтамеханічны тэхнікум, ён быў першым дырэктарам, рыхтаваў спецыялістаў для МАЗа. Так, у савецкі перыяд на сямейных застоллях спявалі ўсе, бабулі, дзядулі... Людзі хацелі чагосьці душэўнага. Для маёй сям'і — нечаканасць, што раптам я — народная артыстка, салістка Вялікага тэатра... Ганарацца. І ўсе мае сваякі зараз ходзяць у оперу.

***— А як трапілі ў Вялікі тэатр, які таксама можна назваць вашай сям'ёй?***

— Калі заканчвала Акадэмію музыкі, усе пайшлі праслухоўвацца... І я пайшла. І ў музкамедыю, і ў оперны. У оперны чатыры разы праслухоўвалася. Оперны тэатр у Беларусі адзін — талентаў шмат. Складаны быў шлях. На 0,25 стаўкі напачатку ўзялі, пасля тры гады працавала на паўстаўкі, маленькія ролі... Я доўга даказвала сама сабе і тэатру, што вартая быць салісткай. У гэтым годзе — 20 гадоў, як я ў тэатры, і ўвесь гэты час працягваю вучыцца. На сцэне заўсёды відаць унутраны змест артыста. Калі за душой нічога няма, то ён не стане эмацыянальным сасудам, які праз сябе прапускае геніяльную музыку.

### *SOL.* Як праспяваць тры гадзіны і не надарваць голас

*Гэтая нота не ад «соль», як шмат каму здаецца, а ад «solis» — Сонца. Сонца спевака — талент... А вось соль яго прафесіі — цяжкая праца. Здаецца, што спявак з абсалютным слыхам адразу можа паўтарыць любую арыю, і на гэтым усё...*

— Справа не ў тым, каб паўтарыць. Ты павінен ужыцца ў сваю партыю, галасавыя звязкі павінны прывыкнуць да пэўных інтэрвалаў, да тэксту. Можна праспяваць так, што пасля два тыдні будзеш маўчаць, бо нават размаўляць не зможаш. Засваенне партыі часта займае два-тры месяцы. Не таму, што спявак ноты кепска вывучыць, а таму, што трэба «впеть» партыю, укласці яе ў галаву, на звязкі, спачатку з канцэртмайстрам у класе, потым на сцэне. Зрабіць так, каб ты выходзіў і тры гадзіны спяваў, не задумваючыся, так, як гаворыш, як дыхаеш. У нас рэпертуарны тэатр, спектаклі оперы ідуць праз дзень, сёння ты спяваеш адну партыю, заўтра — другую, яшчэ праз дзень — трэцюю, на розных мовах.

***— Спаконвек голасам лячылі або насілі шкоду, узносілі малітвы... Гэты бок свайго дару вы адчуваеце?***

— Тэмбральна чалавеку голас дастаецца генетычна, ад бацькоў. Але лічу, што тэмбр голасу адлюстроўвае характар чалавека, яго душу. Аднаго спевака хочацца паслухаць яшчэ раз, а другога — і добра нібыта спявае, а сэрца не кранае. Да нас прыходзяць людзі, якія хочуць знайсці душэўную раўнавагу, ачысціцца ацаляльнай сілай класічнай музыкі. Мастацтва заўсёды было выхаваўчае, таму мне вельмі шкада, што ў школе няма ўрокаў спеваў і музыкі. Як сённяшнія вучні прыйдуць да нас у тэатр, калі не ведаюць, што такое опера? Такія прадметы, як спевы і маляванне, развіваюць шматбаковую асобу. Урокі музыкі трэба вяртаць на дзяржаўным узроўні.

### *LA.* Эмоцыя плюс

*«Lactea via», Млечны шлях, які беларусы называлі Птушыным дарогай...*

***— З выхаду на сцэну ў якой оперы пачаўся ваш шлях?***

— У дыпломным спектаклі Акадэміі музыкі ў мяне была партыя Тацццяны ў «Яўгеніі Анегіне». А ў тэатры напачатку маладому артысту даюць маленькія партыі, у мяне была Першая дама ў «Чароўнай флейце» Моцарта. Моцарт для маладых спевакоў вельмі карысны, «вучэбна-лячэбны» кампазітар. Пасля была партыя Іаланты, ужо адна з найскладанейшых, Мікаэлы ў «Кармэн». Так склаўся лёс, што мне хутка пачалі даваць галоўныя партыі. У мяне амплуа лірычнай гераіні — вобразы, якія ідэальна кладуцца на мой характар.

***— Ну так, вы ж прызнаваліся, што вы чалавек вельмі ўражлівы і эмацыянальны...***

— Для жыцця гэта не вельмі добра, а для сцэны — наадварот. Таму што я магу сваю эмоцыю перадаць гледачу.

***— Некаторыя оперныя спевакі спрабуюць сябе ў іншых жанрах. Рок-опера, джаз, эстрада... У вас не было такога жадання?***

— Вядома, калі ты авалодаў опернай манерай, можаш спяваць любую музыку. Пытанне — ці хочаш? Мне цікавая класічная музыка. Калі я буду выходзіць у іншым жанры, усё адно буду спяваць у той жа манеры. Прыклад — наш праект «Опера плюс джаз». Хаця джаз блізкі да оперы па сваёй шматпланавасці і інтэлектуальным пасыле, я не валодаю стылістыкай джазавай спявачкі. Што датычыцца рок-оперы... У маёй сям'і рок не слухалі. Маці купляла пласцінкі бардаў, Высоцкага, Акуджаву...

### *SI.* Калі зоркі вышываюць крыжыкам

*Гэтая нота адсылае да «siderae», нябёсаў, месца, дзе жывуць зоркі.*

***— У вас, напэўна, ёсць свой фан-клуб, як у кожнай прымадонны...***

— Я пра гэта ніколі не думала. Я чалавек вельмі просты, дастаткова сціплы, не люблю пафасу ўсёй гэтай «зорнасці», пакланення... Камусьці з гледачоў падабаецца больш адзін артыст, камусьці другі, але яны глядзяць на ўсіх нас. Яны любяць наш тэатр. Оперны артыст можа прыехаць у любую краіну, спяваць на мове арыгінала і яго прымуць па яго таленце. Але самае галоўнае, што табе ёсць куды вярнуцца, што ў цябе ёсць твой родны тэатр, свае гледачы.

***— Музыкам у побыце складана, напэўна... Трэба ж рэпеціраваць...***

— Я, папраўдзе, дома не спяваю, мне дастаткова нагрузкі ў тэатры. Гэта стэрэатып, што оперны спявак спявае з раніцы да вечара. У яго ёсць перыяд галасавога спакою, каб голас адпачываў. Голас — адзіны музычны інструмент, які знаходзіцца ўнутры чалавека. І ты мусіш навучыцца быць з ім у ладзе.

***— Займаецеся побытам, гатаваннем?***

— Так, як звычайная беларуская жанчына.

***— Ні хатніх работніц, ні заказаў з рэстаранаў?***

— Не. Стравы гатую, вядома, простыя, якія робіцца хутка. Калі нарадзілася дзіця, я была студэнткай Акадэміі музыкі. Давялося так арганізоўваць час, каб і вучыцца, і выхоўваць сына, і спяваць. Для мяне гатаваць не робіць ніякай праблемы. Накруціла фаршу, зрабіла катлеты, пайшла на працу...

***— А сыходзіце рана? Вы жаўранак?***

— Рэпетыцыі пачынаюцца з адзінаццаці раніцы, бо спектаклі заканчваюцца позна. Калі звычайны чалавек у шэсць-сем вечара ўжо дома, то ў нас у гэты час толькі пачынаецца спектакль. Але неяк усё паспяваю. Мне падабаецца, калі шмат спраў, калі ўсё рухаецца.

***— А як адзначылі гэты Новы год?***

— Былі, вядома, традыцыйныя канцэрты і 31, і 30, і баль у Прэзідэнта 28 снежня. Ужо пяты раз адбыўся такі баль для найлепшай студэнцкай моладзі, мы паказвалі для іх урывак з оперы «Фігара». Калі ў артыста ўвесь час ёлкі, канцэрты, спектаклі, хочацца святкаваць у іншай атмасферы, спакойнай, у коле сям'і. Каб аднавіцца і пасля зноў аддаць гледачу эмоцыі.

***— А як аднаўляецеся? Прагулкі на прыродзе?***

— Так, і на прыродзе... І ў басейн можна схадзіць. Заняцца нейкай іншай дзейнасцю...

***— Вас яшчэ і на хобі хапае?***

— Мая мама ўсё жыццё вышывала і мяне навучыла. І я вышываю крыжыкам, толькі апошнія пару гадоў няма часу. Апошні раз вышывала, калі каранавірус быў, у 2020-м, тады мы не так шмат працавалі. Нават маскі пачала вышываць. Мама шыла, а я іх аздабляла беларускім арнаментам і дарыла сябрам.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

У лабірынтах мастацтва

# БАСАНОГІ ПАЭТ

## З гісторыі надмагільнага помніка Янку Купалу



**Вайсковыя могілкі ў Мінску — не толькі адзін з найстарэйшых мінскіх некропаляў (найбольш старыя могілкі — Кальварыйскія), але і музей скульптуры пад адкрытым небам. А ў 1960-х гэтыя могілкі былі самыя прэстыжныя ў Мінску. Як цікава прайсці па іх сцяжынках, каб паглядзець на надзвычай разнастайныя пахавальныя скульптуры нашым вядомым дзеячам культуры... Аўтары многіх барэльефаў, асабліва пасляваеннага часу, забыліся, але два помнікі выкананы прызнанымі майстрамі беларускай савецкай скульптуры. Прыцягвае ўвагу надмагілле Якубу Коласу аўтарства Уладзіміра Ананькі і Мікалая Якавенкі, і Янкі Купалы аўтарства Анатоля Анікейчыка і Андрэя Заспіцкага. Гэта выдатныя ўзоры беларускай мемарыяльнай скульптуры. Помнік Коласу — выява галавы пісьменніка — больш лаканічны і манументальны, а вось помнік Купалу, усталяваны ў 1970 годзе, заслугоўвае асобнай размовы.**

Згадкі пра самы першы помнік Янку Купалу я сустрэла ў матэрыялах Людмілы Рублеўскай пра Уладзіславу Луцэвіч, жонку Купалы. Людміла Рублеўская знайшла ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва цікавы дакумент, паштоўку, якую Уладзіслава Луцэвіч даслала ў Маскву сваёй сяброўцы, Канстанцыі Буйло, у канцы 1942 года:

«Имею просьбу, Костка, к тебе. Подъедь в крематорий и посмотри, как там Янки памятник. Дай руб. сто женщине, которая там ухаживает, такая старуха».

З гэтага паслання вынікае, што на маскоўскіх Ваганькаўскіх могілках, дзе захоўваўся прах паэта пасля крэміравання, меўся нейкі помнік. Мне падаецца найбольш верагодным, што гэта быў помнік (магчыма, бюст) працы Аляксея Глебава, які ляпіў Янку Купалу яшчэ пры яго жыцці. Тым больш Глебаў на час гібелі Купалы знаходзіўся ў Маскве — на пачатку вайны скульптар на фронце быў паранены, яго адаслалі ў шпіталь у Маскву, потым ён працаваў у агітаддзеле Цэнтральнага штаба партызанскага руху.

Як вядома, перапахаванне паэта з Ваганькаўскіх могілак у Маскве на Вайсковыя могілкі прайшло ў ліпені 1962 года. Захавалася нешматлікія фотаздымкі з гэтай падзеі. А як выглядала магіла Купалы з 1962-га да 1970-х гадоў, успамінаў вельмі мала. На месцы пахавання быў пабудаваны склеп з бронзавай плітой з лаканічным надпісам. Паўліна Мядзёлка ў сваім дзённіку так згадвае пра пахаванне Купалы: «Устаўляюць труну ў падрыхтаваны склеп. Замуроўваюць».

Меркавалася зрабіць на гэтым месцы велічны помнік. На Вайсковых могілках ужо была магіла Якуба Коласа, які памёр у 1956 годзе, і жонкі Янкі Купалы Уладзіславы Луцэвіч, якая была пахавана тут у 1960 годзе.

Бліжэй да 90-гадовага юбілею паэта саспела вострая патрэба зрабіць помнік. Можна было адаптаваць добра вядомыя скульптурныя выявы народных мастакоў Беларусі — бюст Купалы работы Заіра Азгура і скульптуру Купалы, які сядзіць у фатэлі, зробленую Аляксеем Глебавым яшчэ ў 1940-я гады, але яны былі занадта натуралістычныя, а эстэтыка «адлігі» 1960-х патрабавала большай узнёсласці. Зрабіць помнік прапанавалі маладым скульптарам Анатолю Анікейчыку і Андрэю Заспіцкаму і архітэктару Міхаілу Мызнікаву, якія на той час пасля раптоўнай смерці свайго настаўніка Аляксея Глебава ўжо працавалі ў камандзе над вялікім помнікам Янкі Купалы ў цэнтры Мінска каля яго мемарыяльнага музея і таму былі, як гаворыцца, у тэме.

Анікейчык, атрымаўшы такі заказ, адчуваў вялікую адказнасць, тым больш што іканаграфія Купалы ў беларускай станковай скульптуры на той час толькі распрацоўвалася. Мастакі старэйшага пакалення — Аляксей Глебаў, Міхась Роберман, Андрэй Бембель, Заір Азгур — стварылі выдатныя партрэты Купалы, бо бачылі яго, былі з ім знаёмыя да вайны. Шмат людзей пасляваеннага часу яшчэ добра памяталі Купалу. Анікейчык павінен быў стварыць вобраз песняра і захаваць пазнавальнасць, партрэтнае падабенства. Ён натхняўся ўспамінамі, кінакадрамі, фотаздымкамі і прыжыццёвымі партрэтамі мастакоў, якія пісалі яго з натуры, — Дзмітрыя Полазава, Якава Кругера, Валянціна і Анатоля Волкавых, Івана Ахрэмчыка.

«Я заўсёды любіў Купалу як паэта і як чалавека. Мяне вабіла яго глыбіня», — гаварыў ён у інтэрв'ю ў тэлевізійным фільме Алега Белавусава ў 1975 годзе. «Мне імпануе сам тыпаж, склад яго твару, непаўторнасць яго чэрапа, — казаў ён. — Цяжкія павекі, нос з невялікай гарбінкай, з вельмі пачуццёвымі ноздрамі... Мяне гэта хвалюе, падабаецца. Я хацеў у кожнай сваёй рабоце адкрыць нешта новае».

Анікейчык адштурхнуўся менавіта ад вобраза свайго настаўніка Аляксея Глебава — яго фігуры паэта ў фатэлі, з плашчом, але кардынальна перарабіў яго занадта бытавы вобраз у больш рамантычны.

Пецярбургскі мастацтвазнаўца Іван Чачот трапна заўважыў, што скульптура арганічна адчувае сябе толькі на могілках, бо яна нарадзілася як мемарыяльная. Надмагільны помнік знакамітым людзям — асаблівы жанр у скульптуры. Ён патрабуе ад скульптара ўмення стварыць меланхалічны настрой і ўлічыць наяўнасць сакральнай прасторы для пакланення — прадуманага месца для ўскладання кветак і вянкоў, для масы людзей побач. Усю прастору вырашае архітэктар, справа скульптара — стварэнне вобраза.

Кампазіцыя задумана аўтарамі на нізкім пастаменце, літаральна некалькі сантыметраў ад зямлі, і на фоне сцяны з чырвонага каменю. Гэты прыём максімальна набліжае яго да наведвальнікаў. І хоць абмяжоўвае ракурсы агляду, не дае магчымасць абыходу, але выконвае важную ролю адасаблення ад гарадской прасторы, ад вуліцы з жылымі дамамі, якія былі б бачныя без гэтай сцяны і ўрываліся б у аўру гэтага манумента.

Купала паказаны ўжо ў немаладым узросце з прыкрытымі вачыма, паглыбленым у сябе, у свае вершы-імправізацыі. «Мне сняцца сны аб Беларусі» — вершаваны дэвіз гэтага помніка. Аўтар «пасадзіў» фігуру паэта на нешта, што нагадвае сукаваты пень, апрануўшы яго ў народную простую вопратку — світку і порты, як быццам ён выйшаў з дому і прысеў адпачыць. Сапраўды, у Ляўках быў любімы «купалаўскі» пянёк, на якім ён любіў сядзець. Босыя ногі паэта (надзвычай далікатна прыменены наватарскі прыём), як і нізкі пастамент і пень, урослы ў зямлю, павінны падкрэсліваць сувязь паэта з роднай зямлёй. Вялікі плашч, які ахутвае постаць паэта і развяваецца ад ветру, падкрэслівае рамантычнасць вобраза. Лепка фігуры свабодная, шырокая, амаль імпрэсіяністычная, без дэталізацыі, але галава вылеплена крыху інакш, больш падрабязна, з псіхалагічным досведам, які грунтуецца на апошніх фотаздымках паэта.

Мемарыял Купалу быў усталяваны на Вайсковых могілках у 1970 годзе, і каманда маладых скульптараў засяродзілася на манументальным помніку ў скверы імя Янкі Купалы. Гэты помнік стаў сапраўдным узлётам Анатоля Анікейчыка. «Праца гэтая прынесла нам нямала шчаслівых дзён», — расказваў Анікейчык. — Кожны дзень пачынаўся з чытання вершаў Купалы, успамінаў аб ім, чытання стэнаграм яго выступленняў».

Тады скульптар яшчэ не ведаў, што купалаўская тэма стане пажыццёвай яго місіяй, а менавіта гэты помнік-мемарыял натхніць многіх яго вучняў і паслядоўнікаў.

**Надзея УСАВА,**
**вядучы навуковы супрацоўнік**
**Нацыянальнага мастацкага музея.**

Прэм'ера

# ШЧАСЦЕ БЫЦЬ САБОЙ

## Яўген Карняг упершыню прадставіў дзіцячы спектакль «Прададзены смех»

**Ну, як дзіцячы... Пры тым, што ўзроставая катэгорыя пазначана як «6+», гісторыя, прыдуманая пісьменнікам Джэймсам Крусам і ўвасобленая ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек, кранула дарослых не менш, чым дзяцей. А хто ведае, можа, і больш, бо акрамя сюжэта на сталую свядомасць накладваюцца яшчэ і алюзіі ды адсылкі, закладзеныя рэжысёрам па ходзе спектакля — такая інтэлектуальная гульня з бацькамі, якія прывялі дзяцей у тэатр, каб нікому не было сумна. А калі дарослыя яшчэ і дасведчаныя тэатралы, знаёмыя з творчасцю аднаго з самых адметных рэжысёраў Беларусі, то іх наогул чакае інтрыга. Першы! Дзіцячы! Спектакль Карняга! Таго самага, хто аддае перавагу чорнаму колеру і праз яго стварае непадобны ні на кога стыль, а тут фактычна — казачная гісторыя. Ну-ну...**



Хлопчык Цім Талер умеў яскрава смяяцца. Яго дзіўны смех запальваў радасцю сэрцы тых, хто быў побач. Але Цім не адчуваў шчасця, асабліва калі пасля смерці таты застаўся з мачахай, якая яго не любіла. А любому дзіцяці хочацца, каб яго любілі. Любяць, напэўна, тых, хто багаты. І аднойчы Цім знаходзіць грошы, з якімі ідзе на іпадром. Вось дзіва: яго стаўка выйграе! Цім радуецца, яшчэ не разумеючы, што трапіў у пастку. Бо загадкавы барон Трэч ужо пачаў сваю гульню. Яго стаўка значна больш высокая — ён хоча атрымаць смех Ціма, пазбавіўшы яго назаўсёды асаблівага дару. А ў хлопчыка ўзамен з'явіцца магчымасць выйграваць любую спрэчку. Праўда, ён цяпер будзе заўсёды сумны. Затое багаты. Але дзе тое жаданае шчасце?.. Адна скруха. Бедны, бедны маленькі Цім, ён стаў зусім няшчасны...



У казцы сапраўды можа быць страшна, папярэджвае адна з трох апавядальніц, якія ўводзяць у сюжэт і час ад часу правакуюць на адвольныя эмоцыі. Нават па выглядзе зразумела: дамачкі непрадказальныя, страшнае яны могуць ператварыць у камічнае. Такія гламурныя паненкі-лялечкі — паглядзіш на іх, і падсвядома разумееш: усё будзе добра, бо яскравае на гэты раз перамагае чорнае.

І зноў дзякуючы мастачцы Тацяне Нерсісян, з якой рэжысёр Яўген Карняг паставіў не адзін спектакль. Але такое буйства фантазіі і колераў яны берaглі, відаць, менавіта для дзіцячай пастаноўкі, дзе павінна панаваць радасць, нягледзячы ні на якія сюжэтныя выкрутасы. Паколькі інсцэніроўку рэжысёр стварыў сам, то адаптаваў яе так, каб не моцна абцяжарваць гледача, калі той паглыбляецца ў сюжэтную лінію. Сюжэт тут не проста распавядаюць — яго ў большай ступені паказваюць і абазначаюць сімвалічна, ды нават музычна.

«Прададзены смех» — усё ж глыбокая гісторыя сама па сабе, а спектакль даволі працяглы — на два акты. Трымаць увагу гледача (асабліва маленькага) увесь час на адным узроўні было б складана, калі б не рваны рытм спектакля. Сачыць даводзіцца не столькі за сюжэтам — яго расповед падмацаваны метафарычным увасабленнем (напрыклад, тыя ж перамогі коней на іпадроме непадобная адна на другую ды інш.), таму тут усё зразумела і даходліва. Акрамя таго, градус зацікаўленасці і ўцягнутасці ў дзею падтрымліваюць то звароты да публікі з простымі пытаннямі, то акцёрскі інтэрактыў у самой зале, калі кожны глядач становіцца ўдзельнікам таго, што адбываецца: напрыклад, перадае ліст, каб Цім паспеў збегчы з-пад варты барона. То сапраўдныя жахі ды цуды (тут барон Трэнч узнікае там, дзе яго не чакаеш, тут і трамвай, які лятае, ды жудасныя лапы, якія раптоўна вылазяць з цемры). Тут і песні, якія дазваляюць гледачам перавесці дух, паспачуваць ці парадавацца разам з героямі (за музычную частку адказвала Кацярына Аверкава).

Ды і самі героі вельмі розныя. Некаторыя ролі выконваюць толькі самі акцёры, а некаторыя ўвасоблены акцёрамі з дапамогай лялек. І яны таксама здзіўляюць. Вось вам мачаха — ну сапраўдная змяя, здольная ўкусіць сваім зубам, што тырчыць навідавоку, — ніякіх варыянтаў нармальнага жыцця побач з такой у Ціма не будзе. Фрау Бербер надзімаецца ў пышку на нашых вачах — зразумела, што па торт Цім пойдзе да гэтай цётачкі. Крашымір з яркімі вачыма — гэта яго асабістая ўласцівасць, якая таксама прыцягнула ўвагу барона Трэнча. А вось Рыкерт, наадварот, успрымаецца як абсалютна чалавечны чалавек. Таму што не павінна быць так, каб у няшчаснага сіраты не было на каго абаперціся ў жыцці.

Але галоўны, безумоўна, сам Цім. Малы Цім, як яго называюць. Сапраўды, лялька, якая яго ўвасабляе, самая маленькая на сцэне. Нават рыбкі, якія ўсяго толькі абазначаюць водную стыхію, і то здаюцца больш прыкметнымі. Але толькі вонкава. Бо лялька Ціма такая мілая, крохкая і рэальна завадная, асабліва калі ён радуецца, у яе бадзёра ўздымаюцца ручкі. І гэта цуд, бо ў самыя пікавыя моманты акцёр Дзмітрый Чуйкоў сыходзіць у цень. Лялька нібыта ажывае, становіцца самастойнай і вельмі прывабнай — што ні кажы, а гэты малы ўмее радаваць. І сапраўды адчуваеш, што смех Ціма здольны рабіць шчаслівымі іншых. Ну рэальна!..

І як жа цудоўна, што Цім знайшоў магчымасць зноў стаць сабой. Мараль аповесці Круса, падобнай на прыпавесць, скіраваная, канешне, у большай ступені на падлеткаў, якія шукаюць сябе і пачынаюць задумвацца пра каштоўнасці гэтага свету. Прынамсі, менавіта ў гэтым цудоўным узросце я пазнаёмілася з Цімам Талерам. А потым яшчэ паглядзела савецкі фільм — ён не быў надта просты, прыцягнуў увагу якраз сур'ёзнасцю падачы і запрашэннем да разваг (што ўласціва падлеткам). Спектакль Яўгена Карняга на пару гадзін прымусіў вярнуцца ў той дзіўны ўзрост, калі разважаеш пра ісціны чалавечага свету. І калі хочацца, каб яны адкрываліся як цуды. Дакладна гэта гісторыя для дарослых дзяцей. І для дзяцей, якія не паспелі стаць дарослымі. Цяжка ўявіць сябе зусім маленькай (на 6+), але, напэўна, візуальны шраг і гульнявы падыход — тое, што будзе чапляць і такіх гледачоў. Пры ўмове, што астатняе пасля дапоўняць таты з мамамі, якім дакладна будзе пра што паразмаўляць з дзеткамі пасля спектакля.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Управление механизации № 91», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11/7 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Административное помещение** (административное помещение) общей площадью 39,9 кв. м, инв. номер 500/D-708004811, по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 7 | 177 600,00 |
| 2 | **Административное помещение** (административное помещение) общей площадью 61,6 кв. м, инв. номер 500/D-708004812, по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 7А | 273 600,00 |

**Обременение по лотам №№ 1–2:** изолированные помещения расположены в капитальном строении, которое является памятником историко-культурного наследия; запрет на совершение регистрационных действий

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона по всем лотам

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона несутся покупателем

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Продавец гарантирует, что запрет совершать регистрационные действия, наложенный органом принудительного исполнения, будет снят после проведения аукциона и не повлияет на результаты аукциона

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты продавцу за проведение независимой оценки и затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **5 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 21.02.2023 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.02.2023 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | |
| **Продавец** | ОАО «Сукно», г. Минск, ул. Матусевича, д. 33. Тел.: +375 (17) 363-99-40 | |
| **Извещение о проведении открытого аукциона** | Дата, время проведения аукциона | Срок подачи заявления на участие в торгах |
| **Предмет аукциона:** имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/10. Полный состав имущества размещен на сайте организатора аукциона www.cpo.by | **23.02.2023 в 14.00** | **С 9.00 20.01.2023 до 17.00 21.02.2023** |

**Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяется ст.ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5 (пять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **10 (десять) дней** со дня проведения аукциона, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере от 1 до 10 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов не менее чем за день до наступления даты проведения торгов без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Мозырский ДОК» (продавец) извещает о проведении 7 февраля 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 20 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** победитель аукционных торгов дополнительно возмещает расходы по предпродажной подготовке: по определению рыночной стоимости в сумме **324,00** бел. руб. | | | |
| **1** | **Капитальное строение с инв. № 331/С-45500** общей площадью **241,3 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **контора**. Адрес: Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. 9 Мая, 58. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321450100004001278** общей площадью **0,2072 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. 9 Мая, 58. **Целевое назначение земельного участка:** для размещения объектов административного назначения | **38 688,00** | 3 868,80 |

**Продавец:** ОАО «Мозырский ДОК». 247760, г. Мозырь ул. Социалистическая, 120а.

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляется по контактному тел.: **8 (044) 757-56-50, директор филиала Звертовский Сергей Григорьевич. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (ОАО «Мозырский ДОК»):** р/с BY72 AKBB 3012 0142 7309 3330 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 317, УНП 490617960, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 23 января 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 3 февраля 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона. **Условия оплаты:** 50 % цены продажи объекта в течение 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи; остальные 50 % цены продажи объекта в течение 30 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)».

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by** в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 08.12.2022 г. № 241 (29863).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

**Лот № 1.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (фундамент – бетон, площадь застройки – 71 кв. м, процент готовности – 12 %) по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Осиновка, ул. Полевая, 6А и земельный участок с кадастровым № 221287013101000145 площадью 0,1500 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Осиновка, ул. Полевая. Ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Осиновское), охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/ зем. участок): **4896,07** (2286,07/2610,00) бел. руб.
**Задаток:** 489,60 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 46,69 %.

**Лот № 2.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (фундамент – бетон, площадь застройки – 66 кв. м, процент готовности – 12 %) по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Перевоз, ул. Центральная, 3Б и земельный участок с кадастровым № 221287015101000052 площадью 0,1257 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Перевоз, ул. Центральная. Ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Лучеса).
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/ зем. участок): **5220,83** (3830,52/1390,31) бел. руб.
**Задаток:** 522,08 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 73,37 %.

**Лот № 3.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (фундамент – бетон, площадь застройки – 74 кв. м, процент готовности – 12 %) и земельный участок с кадастровым № 221287012101000876 площадью 0,1500 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Солнечная, 56. Ограничения: охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/ зем. участок): **13159,30** (3979,04/9180,26) бел. руб.
**Задаток**: 1315,93 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 30,24 %.
**Реквизиты для внесения задатка по лотам №№ 1–3: р/с:** BY87 AKBB 3604 3141 0001 5200 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300977139, код операции 40901. Получатель платежа: Новкинский сельисполком

**Лот № 4.** Не завершенный строительством законсервированный жилой дом с инв. № 200/U-98184 (срок консервации истек) наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, назначение – здание неустановленного назначения (фундамент – сваи металлические, железобетон, площадь застройки – 93 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 221285904101000184 площадью 0,1324 га в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома (размещения объектов усадебной застройки) с объектами обслуживания по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Дреколье, ул. Центральная, 45А. Ограничения: водоохранные зоны водных объектов.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/ зем. участок): **8586,84** (6347,59/2239,25) бел. руб.
**Задаток:** 858,68 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 73,92 %.
**Реквизиты для внесения задатка по лоту № 4:** р/с BY88 AKBB 3604 3140 9001 1200 0000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300933110, код операции 40901. Получатель платежа: Мазоловский сельисполком

**Дата, время и место проведения аукциона: 22.02.2023 в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**

**Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 23.01.2023 до 13.00 21.02.2023.** Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия для победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона**: **лоты №№ 1–4**: в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся в организацию по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним; **лоты №№ 1–3**: получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта, разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев с даты осуществления государственной регистрации права на зем. участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить возведение жилого дома в сроки, установленные Указом Президента РБ от 07.02.2006 № 87, выполнить ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с действующим законодательством; **лот № 4:** получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев с даты осуществления гос. регистрации права на зем. участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить возведение жилого дома в сроки, установленные Указом Президента РБ от 07.02.2006 № 87 «О некоторых мерах по сокращению не завершенных строительством незаконсервированных домов, дач», выполнить ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с действующим законодательством. **Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: лоты №№ 1–3** – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме); **лот № 4** – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома с объектами обслуживания. Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. *По лоту № 4 выполнены проектные, изыскательские работы по газоснабжению, а также выполнены работы по газоснабжению (согласно документам собственника участка).*

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.**

**Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ)**, которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

**Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні адчуеце ўсю ўладу сваёй абаяльнасці, а ўвага навакольных толькі ўмацуе ваша становішча. Ваша арыгінальная прапанова ў аўторак можа падаць калегам па працы рызыкоўнай, але толькі яна дапаможа зладзіцца з сітуацыяй. У чацвер і пятніцу непажадана браць на сябе лішнія прафесійныя абавязкі, інакш яны могуць стаць для вас непасільным цяжарам. У нядзелю запланаваны адпачынак паграджае сарвацца з-за важных спраў.

**ЦЯЛЕЦ.** Вас чакае поспех на рабоце. Мабілізуйце сілы ў калектыўнай дзейнасці і цікавых праектах. Менавіта зараз вы зможаце стаць лідарам і арганізатарам. Старайцеся не раздражняцца па дробязях і не злавацца на калег за залішнюю старанасць і дробныя памылкі. Затрымкі і правалокі могуць злёгку расчараваць, пастаўцеся да гэтага па-філасофску. Чым больш стрыманымі будзеце, тым лягчэй, больш канструктыўна будзеце падыходзіць да вырашэння праблем. У нядзелю — пасіўны адпачынак.

**БЛІЗНЯТЫ.** Будзеце вельмі прывабныя. Багацце кампліментаў можа закружыць галаву, але самае цікавае, што ўсе гэтыя прыемныя словы — праўда. Жаданні пачнуць здзяйсняцца, так што, загадваючы іх, будзьце асцярожныя. І не саромейцеся выкарыстоўваць сваё абаянне не толькі ў асабістых, але і ў дзелавых мэтах. У выхадныя будзьце гатовыя весяліцца так, быццам вам зусім усё роўна, што будзе пасля.

**РАК.** На гэтым тыдні важныя такія якасці, як цярплівасць і сіла волі. У панядзелак з'явіцца шанц прасунуцца па кар'ернай лесвіцы. Але не думайце, што ўзятая вышыня — нагода расслабіцца. Канкурэнты не дрэмлюць, адзін неасцярожны рух — і карона ўжо не ваша. Адмысловую каштоўнасць будзе мець пачуццё гумару — паспрабуйце не губляцца, а адказваць прыстойна.

**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні магчыма далёкая камандзіроўка. Пастаўцеся з увагай да новых знаёмых і да іх прапаноў. Серада — добры дзень для таго, каб даведацца штосьці новае ці пачаць вучыцца. У чацвер пастарайцеся стрымліваць эмоцыі, уважліва сачыце за сваімі словамі і паводзінамі суразмоўцаў. Магчыма, такім чынам вы пазбегнеце буйных непрыемнасцяў. У пятніцу варта сходзіць да псіхолага ці хаця б пагаварыць па душах з сябрамі.

**ДЗЕВА.** Ваша энергія практычна ніколі не заціхае, толькі не наламайце дроў. У сераду планы могуць змяніцца. Для новага вітка духоўнага росту і развіцця вам неабходна бязлітасна пазбаўляцца ад усяго непатрэбнага, што стварае ў вашым жыцці блытаніну. У чацвер не дазваляйце калегам уцягнуць сябе ў канфліктную сітуацыю. У суботу візіт да сваякоў акажа на вас дабратворны ўплыў.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні будзьце вельмі ўважлівыя нават да самых нязначных змен на працы, бо разумная пільнасць яшчэ нікому не шкодзіла. У аўторак лёгка знойдзеце агульную мову з начальствам і падначаленымі. Усе важныя службовыя пытанні добра было б вырашыць да пятніцы. У выхадныя дні нікога не слухайце і паспрабуйце адпачыць так, як вам гэтага хацелася.

**СКАРПІЁН.** Вас чакаюць спрыяльныя змены ў асабістым жыцці. Кантакты і сустрэчы адбяруць шмат часу, затое прынясуць даход у будучыні. У сярэдзіне тыдня асаблівую важнасць набудзе духоўна-маральны аспект. У выхадныя зможаце вырашыць даўнія супярэчнасці ў сям'і і здабыць гармонію.

**СТРАЛЕЦ.** Цвёрдасць і рашучасць дапамогуць у ажыццяўленні планаў. Але разлічваць давядзецца толькі на ўласныя сілы. Паспрабуйце пазбягаць усяго таемнага і закулісная, не дазваляйце ўцягваць вас у якія-небудзь інтрыгі і змовы. Уласнымі перажываннямі лепш дзяліцца толькі з найбліжэйшымі і праверанымі сябрамі. У суботу давядзецца выдаткаваць нямала сіл, каб прымусіць навакольных прыслухацца да вашых парад.

**КАЗЯРОГ.** Удалы тыдзень для тых, хто робіць кар'еру. Трэба знайсці час для пашырэння прафесійных ведаў. Кожны новы навык, набыты зараз, можа аказацца запатрабаваным літаральна з хвіліны на хвіліну. Добра пройдуць паездкі і камандзіроўкі. Галоўнае — пазбягайце канфліктаў з начальствам. У канцы тыдня вас чакае бурнае асабістае жыццё.

**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні будзеце шмат разважаць і атрымаеце вельмі карысную інфармацыю. Можаце ўбачыць свет па-новаму і адрадзіць некаторыя старыя ідэі, злёгку падкарэкціраваўшы іх. Сям'я і сябры, па ўсёй верагоднасці, наўрад ацэняць па вартасці вашы дасягненні, і не чакайце пахвалы. Вы самі ведаеце прa сябе ўсё. У нядзелю варта быць больш уважлівымі.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні магчыма павышэнне па службе, якога вы так доўга чакалі. Пажадана не выяўляць пачуцці, якія перапаўняюць вас, занадта бурна, трымайце дыстанцыю з калегамі і начальствам. Паспрабуйце не правакаваць плёткі, выявіце дысцыплінаванасць і сабранасць. У суботу адчуеце прыліў сіл — нібы адкрыецца другое дыханне. Скарыстайцеся гэтай магчымасцю і займіцеся назапашанымі хатнімі справамі. Паспрабуйце не злоўжываць добрым стаўленнем да вас сваякоў.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.13 | 17.29 | 8.16 |
| Віцебск — | 9.09 | 17.13 | 8.04 |
| Магілёў — | 9.04 | 17.19 | 8.15 |
| Гомель — | 8.53 | 17.22 | 8.29 |
| Гродна — | 9.28 | 17.45 | 8.17 |
| Брэст — | 9.21 | 17.52 | 8.31 |

## Месяц

*Маладзік у 23.53.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

*Пр. Антона, Васілісы, Віктара, Георгія, Емяльяна, Ілы, Міхаіла, Рыгора, Сідара.*
*К. Агнешкі, Аўгуста, Інесы, Людвіка, Яраслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 21 СТУДЗЕНЯ

У краіне

**1818** год — нарадзіўся (в. Слівіна Мсціслаўскага павета) Адам Ганоры Кіркор, беларускі этнограф, гісторык, археолаг, публіцыст, выдавец, член-карэспандэнт Імператарскага археалагічнага таварыства, член Рускага геаграфічнага таварыства, Акадэміі навук у Кракаве. Вучыўся ў Магілёўскай і Віленскай гімназіях. З 1849 года — член Віленскага статыстычнага камітэта. У 1850—1854 гг. — рэдактар «Памятной книжки Виленской губернии», у якой публікаваў свае працы па гісторыі і этнаграфіі Літвы і Беларусі. Праводзіў археалагічныя, этнаграфічныя, краязнаўчыя даследаванні ў Віленскай і Мінскай губернях; у Барысаўскім, Вілейскім, Віленскім, Лідскім, Мінскім, Навагрудскім, Ашмянскім паветах. Вывучыў больш за 1 тысячу курганоў. З'яўляўся членам Віленскай археалагічнай камісіі, захавальнікам Віленскага музея старажытнасцяў, якому перадаў сваю калекцыю археалагічных знаходак. Запісаў узоры вусна-паэтычнай народнай творчасці, абрады, звычаі, гульні, танцы, народныя святы беларусаў.



**1903** год — нарадзіўся (г. Гомель) Георгій Рыгоравіч Ніскі, савецкі жывапісец і графік, народны мастак Расіі, правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР. Вучыўся ў Гомельскай студыі імя М. Урубеля, у Вышэйшых мастацка-тэхнічных майстэрнях і Вышэйшым мастацка-тэхнічным інстытуце. Сярод твораў: «Беларускі пейзаж», «Верхняя Волга», «Пейзаж з маяком» і іншыя. Краявіды мастака прасякнуты лірычным пачуццём, рамантыкай, вызначаюцца смеласцю і выразнасцю кампазіцыйных і каларыстычных рашэнняў. Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1924** год — нарадзіўся (в. Бардзілаўка Мінскага раёна) Фёдар Апанасавіч Бачыла, удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, журналіст, заслужаны работнік культуры Беларусі. Камандзір дыверсійнай групы, якая падарвала 28 варожых эшалонаў. З 1949 года працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». Аўтар кнігі «Застаюся жыць».

**1939** год — у Мінску заснавана Дзяржаўная карцінная галерэя БССР (з 1992 года — Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь).

У свеце

**1775** год — у Маскве на Балотнай плошчы пакараны Емяльян Іванавіч Пугачоў.

**1793** год — Вялікая французская рэвалюцыя: па пастанове суда пакараны Людовік XVI, апошні манарх Францыі Старога парадку, абвінавачаны ў змове супраць свабоды нацыі і супраць агульнай бяспекі дзяржавы.

**1885** год — нарадзіўся Умберта Нобіле, італьянскі канструктар дырыжабляў і палярны даследчык.

**1903** год — нарадзіўся Ігар Курчатаў, савецкі фізік, бацька савецкай атамнай бомбы. Тройчы Герой Сацыялістычнай Працы. Акадэмік АН СССР, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Галоўны навуковы кіраўнік атамнага праекта ў СССР, адзін з заснавальнікаў практыкі выкарыстання ядзернай энергіі ў мірных мэтах. Лаўрэат Ленінскай прэміі і чатырох Сталінскіх прэмій.

Так гаварыў...

**ГІПАКРАТ:**

*«Перш чым узяцца каго-небудзь лячыць, варта даведацца, ці гатовы ён пакінуць усё тое, што зрабіла яго хворым».*

## УСМІХНЕМСЯ

Бландзінка тэлефануе свайму сябру:
— Ты навошта параіў мне вокны на зіму заляпіць?
— А што, цяпер у кватэры занадта цёпла?
— Не, цёмна!

**— Прыкінь, Сцяпан, а бландзінкі сапраўды тупыя.**
**— З чаго ты ўзяў?**
**— Дык мая ўчора пафарбавалася пад бландзінку і ўчыніла ўвечары скандал, бо знайшла на ложку чорны волас!**

— Мне доктар прапісаў паўнець. Калі выходзіла, так проста і сказаў — папраўляйцеся.





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 12.768. Індэкс 63850. Зак. № 63.
Нумар падпісаны ў 19.30 20 студзеня 2023 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12